незалежная газета

№ 47 (645) 16 снежня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Алкаеў: Снягір спрабаваў маніпуляваць Лукашэнкам**

Старонка 8



**Аграсядзібы, каб правесці Новы год**

Старонка 5



**Сярога: Чарка і скварка — не для мяне**

Старонка 11

**У НУМАРЫ**

**Майкл Скэнлан: ЗША ўхвальна глядзяць на працяг праграмы МВФ stand-by для Беларусі**

Гутарка з часовым паверанным у справах ЗША ў Беларусі. **Старонка 7.**

**Шушкевіч: Беражыце сумленнасць**

15 снежня Станіславу Шушкевічу, першаму кіраўніку незалежнай Беларусі, споўнілася 75 гадоў. Шчырая гутарка — **старонка 9.**

**Віктар Шалкевіч. Балада пра Славянскі базар**

Паднялась верцікальная планка Сумашэдшых рэшаючых дней... **Старонка 11.**

**«Каб людзі менш пілі, трэба, каб яны большараблялі»**

Пісьменнік і ўласнік гарэлачнага завода. Як гэта спалучаецца ў адным чалавеку? З Леанідам Дайнэкам гутарыць Наталка Бабіна. **Старонка 10.**

**Вандроўка радзімічаў**

V раздзел з кнігі гісторыка Алега Дзярновіча «Гісторыя Беларусі». **Старонка 12.**

# Зэканомяць на ўсіх, акрамя міліцыі

Бюджэт–2010: скароцяцца выдаткі нават на органы дзяржаўнай бяспекі і праўладныя СМІ. У лідэрах па ўразанні — адукацыя і ахова здароўя. **Старонка 4.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## Беларускія ўлады абвяргаюць датычнасць да перавозкі зброі з КНДР



Беларусу-пілоту затрыманага ў Тайландзе самалёта пагражае пажыццёвае зняволенне. **Старонка 2.**

# Лукашэнка хоча асабіста выбіраць інтэрнэт-правайдэраў

У «НН» трапіў праект указа «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт». З яго вынікае, што інтэрнэт хочуць аддаць пад кантроль новай спецслужбе Лукашэнкі.

Паводле гэтага дакумента, кантроль за інтэрнэтам ў Беларусі павінен ажыццяўляцца паводле пастаноў Савета міністраў, па ўзгадненні з новай спецслужбай — Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі прэзідэнта (ААЦ).

У праекце зазначаецца, што пад кантроль ААЦ трапляюць усе інтэрнэт-правайдэры краіны. А вызначаць, каму дазволіць быць правайдэрам, а каму не, будзе асабіста Лукашэнка. «Пералік аператараў электрасувязі, якія маюць права непасрэднага доступу (далучэння) да міжнародных сетак электрасувязі, а таксама ўпаўнаважаных пастаўшчыкоў паслуг сеткі інтэрнэт» будзе вызначаць ААЦ «па ўзгадненні з прэзідэнтам РБ». Паводле таго ж праекта, дзейнасць правайдэра можа быць спынена паводле пастановы Савета міністраў.

### Ні кроку без ААЦ

Таксама Аператыўна-аналітычнаму цэнтру надаецца права забараніць доступ да інфармацыі, якая будзе палічаная «незаконнай паводле беларускага заканадаўства». Рэгістрацыя даменных імёнаў з канчаткам на .by таксама будзе ажыццяўляцца праз ААЦ. Спецслужба будзе кантраляваць і кампаніі, якія займаюцца прадстаўленнем інтэрнэт-паслуг.

Праект указа ўтрымлівае план мерапрыемстваў на бліжэйшы год, якія павінны ажыццяўляцца Саветам міністраў і Аператыўна-аналітычным цэнтрам «з мэтай удасканалення дзейнасці нацыянальнага сегмента інтэрнэта». У трохмесячны тэрмін пасля апублікавання ўказа Саўмін павінен забяспечыць рэгламентацыю дзейнасці беларускіх інфармацыйных рэсурсаў, а таксама прадставіць звесткі аб іх уладальніках. Гэта значыць, незалежныя сайты пачнуць лічыць і перапісваць, цягаючы па бюракратычных працэдурах іх стваральнікаў.

**Працяг на старонцы 3.**

# Беларускія ўлады абвяргаюць датычнасць да перавозкі зброі з КНДР

**Беларусу–пілоту затрыманага ў Тайландзе самалёта пагражае пажыццёвае зняволенне.**

12 снежня ў Бангкоку затрымалі самалёт Іл-76 (бартавы нумар 4L-AWA), зарэгістраваны ў Грузіі. На яго борце было выяўлена амаль 40 тон зброі, у тым ліку ручныя гранатамёты і пераносныя зенітна-ракетныя комплексы.

Паліцыя паведаміла, што камандзір карабля Міхаіл Пятухоў — грамадзянін Беларусі, астатнія члены экіпажа — з Казахстана. Пакуль іх затрымалі на 14 дзён. Але ў перспектыве лётчыкаў могуць пакараць вельмі жорстка — нават пажыццёвым зняволеннем у пекле тайландскай турмы.

Гісторыя з затрыманнем нагадвае шпіёнскі трылер. Самалёт, які яшчэ ў кастрычніку належаў Казахстану, быў нядаўна перададзены грузінскай кампаніі Air West Georgia. Самалёт пятляў. Бытцам бы з Украіны ён вылецеў з дазапраўкамі ў Азербайджане, ААЭ і Тайландзе ў Паўночную Карэю. Рэйс выконваўся на замову кампаніі SP TRAITING, LTD, зарэгістраванай у Новай Зеландыі. Зваротны шлях Іл-76 ведомы не так дакладна. Паводле адной версіі, ён накіроўваўся ў нейкую з краін Паўднёвай Азіі, паводле іншай — назад ва Украіну. Аднак падчас першай дазапраўкі борт быў арыштаваны. Інфармацыю пра груз мясцовая паліцыя атрымала ад спецслужбаў ЗША.

Міхаіл Петухоў сцвярджае, што нічога не ведаў аб характары груза і адмаўляецца даваць паказанні да суда. Адразу пасля прылёту ў Тайланд экіпаж паведаміў, што самалёт перавозіць прылады для буравых вышак.

Хто быў атрымальнікам зброі — невядома. Сусветныя СМІ называюць як Беларусь (The Guardian), так і «Хізбалу» (ліванскае выданне The Daily Star). Газета The Times паведамляе, што некалі затрыманы ў Тайландзе самалёт належаў адной з кампаній Віктара Бута. Гэта адзін з найбольш уплывовых гандляроў зброяй у свеце. Па нейкім таямнічым супадзенні Віктар Бут ужо некалькі гадоў сядзіць у тайландскай турме. Што цікава, у канцы 1990-х — пачатку 2000-х ён неаднаразова наведваўся ў Беларусь.


AP

Каму б ні належала арыштаваная зброя, лёсу экіпажа не пазайздросціш. Пасля развалу СССР і скарачэння ўзбраенняў засталося мноства лётчыкаў, якія, каб выжыць, вымушаныя займацца сумнеўнымі справамі. Наіўна апраўдваца, што не ведалі аб характары грузу. Што яшчэ можна вывозіць з Паўночнай Карэі праз паўсвету? З краіны, якая, акрамя зброі, нічога не ў стане вырабіць. А камандзір самалёта, паводле тайландскіх законаў, нясе поўную адказнасць за характар груза. Нават калі следчым удасца разблытаць загадкавую схему ўласнікаў і арандатараў паветранага судна і груза, прыцягнуць іх да адказнасці наўрад ці ўдасца. Увесь цяжар пакарання ляжа на плечы экіпажа.

Замежная прэса публікуе розныя версіі паходжання зброі, партыя якой знаходзілася на борце затрыманага 12 снежня ў Тайландзе самалёта Іл-76.

Так, брытанская газета «Гардыян» са спасылкай на свае ўкраінскія крыніцы сцвярджае, што адпраўным пунктам палёту Іл-76 была Беларусь, а ў Кіеве ён усяго толькі садзіўся на дазапраўку на шляху ў Паўночную Карэю. Пры гэтым, зазначае выданне, загрузка 40 тон зброі і боепрыпасаў была ажыццёўлена ў Пхеньяне.

У Мінску гэтую інфармацыю абвяргаюць. Дазапраўка ва Украіне выглядае сапраўды нелагічнай.

**Алесь Пілецкі**

## СЦІСЛА

### Чатыры выпадкі пераахаладжэння за суткі

Столькі было зафіксавана за 14 снежня, першы дзень сапраўднага зімовага марозу ў Мінску. Пацярпелыя знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Яшчэ 32 чалавекі звярнуліся ў бальніцы з «галалёднымі» траўмамі — ударамі, звіхамі, расцяжэннямі і пераломамі. Мароз будзе трымацца цэлы тыдзень.

### На навагодні феерверк цераз восем КПП

Ад 24 снежня 2009 года да 8 студзеня 2010 года органы ўнутраных справаў будуць працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Месцы масавых мерапрыемстваў будуць агароджаныя турнікетамі, абследаваныя сапёрамі. Асноўныя месцы свят у Мінску — Кастрычніцкая плошча і тэрыторыя каля стэлы «Мінск — горад герой». Феерверк блізу стэлы пачнецца 1 студзеня ў 1.30. Прапускаць гледачоў на яго плануецца праз восем КПП. На Кастрычніцкай ў навагоднюю ноч будуць працаваць 2300 супрацоўнікаў міліцыі ў форме і прыкладна 100 — у цывільным. Міліцыя прапануе ў навагоднюю ноч пасля 21.00 забараніць продаж спіртнога.

### Апытанне: «Белсат» рэгулярна глядзяць 190 тысяч чалавек

Пасля двух гадоў працы ў эфіры праграмы незалежнага тэлеканала «Белсат» рэгулярна або час ад часу глядзяць у Беларусі 630 тыс. асобаў (8,6% агульнай аўдыторыі). З іх ліку сталых гледачоў — 190 тыс. беларусаў (2,6%). Даследаванне было праведзенае сацыялагічнай службай «Люстэрка-інфо» ў лістападзе.

**Паводле БелаПАН, «Мінск-навіны»**

## Касірка стала ахвярай раздзяўбайства ейнага банка?

Міліцыя звяртала ўвагу кіраўніцтва «Абсалютбанка» на неабходнасць узмацнення аховы абменнага пункта каля сталічнага ўніверсама «Аўтазаводскі» двойчы за гэты год, паведамляе агенцтва БелаПАН. Банкаўскай установе было прапанавана ўсталяваць сігналізацыю з вывадам на пульт дэпартамента аховы МУС, а таксама сістэму відэаназірання.

Нагадаем, 10 снежня ў абменным пункце ля «Аўтазаводскага» была зарэзаная 21-гадовая касірка. Падрабязнасці — **старонка 6**.

## «Міністэрства аховы здароўя лічыць немэтазгодным...»

«Наша Ніва» атрымала адказ на свой запыт аб інфармацыі пра статыстыку смяротнасці ад пнеўманіі і грыпу і магчымасці азнаёміцца з унутранай перапіскай Мінаховы здароўя ў часе эпідэміі грыпу. Такая статыстыка дапамагла б высветліць, ці правільна дзейнічала ўлады ў часе эпідэміі і ці не было свядомай дэзінфармацыі.

Аднак адказу нам не далі.

«Аб прадастаўленні інфармацыі

Міністэрства аховы здароўя на №01–05/2 ад 19.11.2009 г. паведамляе наступнае:

1. Па інфармацыю па першым пытанні Вам неабходна звярнуцца ў Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь.

2. Дакументы па ўнутранай перапісцы Міністэрства аховы здароўя з'яўляюцца службовымі і прызначаныя для кіраўнікоў арганізацый і выкарыстання ў працы дактарамі, у сувязі з чым Міністэрства аховы здароўя лічыць немэтазгодным азнаямленне з дадзенымі дакументамі супрацоўнікаў іншых ведамстваў і арганізацыяў.

Першы намеснік міністра Р.А.Часнойць»

На сёння ёсць толькі разрозненыя звесткі з асобных гарадоў. У Мазыры памерлі прынамсі 9 чалавек, у Светлагорску — 4, у Баранавічах — 3. Найбольшы працэнт пнеўманійных ускладненняў прыпаў на Мінскую вобласць. Аднак у цэлым праўладныя СМІ часта даюць статыстку па Украіне, але ніколі — па Беларусі.

**Рэд.**


# Пара аформіць падпіску

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпіскі.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам

Міхаілу К. з Рэчыцкага раёна.
Сяргею В., Алесю П. з Полацкага раёна.
Віктару А. з Брэста.
Ігару Б., С.Р. з Бярозаўскага раёна.
Васілю Г., Івану К., Андрэю А. з Мінскага раёна.
Святлане Ш., Наталлі М., Л.Г., В.Ш., Тадэвушу Ш., С.П., Віталю Б., Валерыі Ч., Вользе Ш., Леаніду Л., Васілю Б., Рэгіне К., Міхаілу Дз., Паўлу Е., Антону М., Людміле М., Ніне С., Ігару Б., Станіславу Р., Людміле Л., А.Ц., Ніне Н., Аляксандру П.,В.Ч., Мікалаю Дз., А. В., В.Д., Р.Н., Ірыне В., С.К., Л.І., Т.П., Аляксею К., Альберту С., В.Д., Аксане З., С.В., Юрыю А., Людміле Ж., Уладзіславу Ж., Святлане Б., Аксане Д., Н.Ш., Н.М., Святлане Ц., Галіне Т., Валянціне Г., Л.С., В. С. з Мінска.

# Лукашэнка хоча асабіста выбіраць інтэрнэт-правайдэраў

Працяг са старонкі 1.

### Блакаванне сайтаў?

Сапраўдную трывогу выклікае пункт 1.5 праекта: «Пастаўшчыкі паслуг сеткі інтэрнэт паводле запыту карыстальніка аказваюць паслугі па абмежаванні доступу да інфармацыі, змест якой скіраваны на ажыццяўленне экстрэмісцкай дзейнасці» і г.д. За прыгожай фармулёўкай «Паводле запыту карыстальніка» можа хавацца ўсё, што хочаце. Прыгадваецца стары савецкі анекдот: «Усё дзеля чалавека. І мы ведаем імя таго чалавека».

Тым больш што працяг пункта недвухсэнсоўна тлумачыць: «Упаўнаважаныя пастаўшчыкі паслуг сеткі інтэрнэт забяспечваюць у абавязковым парадку абмежаванне доступу да дадзенай інфармацыі пры наданні паслуг ... дзяржаўным органам ..., дзяржаўным арганізацыям, установам адукацыі, культуры». Пад гэты шырокі пералік трапляюць не толькі белтэлекамаўскія пункты карыстання інтэрнэтам, але і ўніверсітэты, інтэрнэт-кавярні, многія іншыя карыстальнікі. І, хто ведае, ці не будзе гэты пункт выкарыстаны для глушэння незалежных інтэрнэт-сайтаў.

### Рэгістрацыя незалежных інтэрнэт-СМІ

Акрамя гэтага, прапануецца вызначыць парадак рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз інтэрнэт, парадак вызначэння карыстальнікаў інтэрнэта ў месцах калектыўнага карыстання, а таксама шэраг іншых мерапрыемстваў.

На працягу года пасля ўступлення ў сілу ўказа плануецца распрацаваць праект Закона аб нацыянальным сегменце сеткі інтэрнэт і прадставіць яго на разгляд Лукашэнку.

А кантраляваць дзейнасць ААЦ будзе... сам ААЦ. Кантроль за выкананнем указа, праект якога трапіў у рэдакцыю «НН», плануецца ўсклasці на Адміністрацыю прэзідэнта і на той самы Аператыўна-аналітычны цэнтр.

**Алесь Пілецкі**

**Аператыўна-аналітычны цэнтр**

быў створаны ў красавіку 2008. Да гэтага часу пры Адміністрацыі прэзідэнта існаваў іншы орган, які займаўся пытаннямі, звязанымі з функцыянаваннем ў Беларусі інтэрнэта — Дзяржаўны цэнтр бяспекі інфармацыі. Тая служба пераважна займалася рэгістрацыяй даменаў у зоне .by і кантактамі з замежнымі арганізацыямі, дзейнасць якіх датычыла сусветнага павуціння.



## КАМЕНТАРЫ

### Старыкевіч: Далей — Паўночная Карэя

**Рэдактар інтэрнэт-выдання «Салідарнасць» Аляксандр Старыкевіч:** «Далей адно — Паўночная Карэя. Тое, што плануецца зрабіць, ўражвае. Што і як будзе выходзіць — іншая справа. Ствараецца адмысловая спецслужба для кіравання інтэрнэтам. Нават сярод самых горшых прагнозаў не было таго пункта, паводле якога Лукашэнка сам будзе зацвярджаць правайдэраў. Усё бярэцца пад кантроль першай асобы дзяржавы — нават не Міністэрства інфармацыі».

### Бастунец: Створацца прававыя ўмовы для блакавання рэсурсаў

**Юрыст, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец:** «Падобнага акта даўно чакалі. Першай спробай узяць пад кантроль інтэрнэт быў Закон аб СМІ. У ім гэтага не зрабілі з шэрагу прычын, сярод якіх геапалітычная кан'юнктура і немагчымасць знайсці рашэнне некаторых прававых пытанняў. Мы вяртаемся да рэгістрацыі інтэрнэт-СМІ, ідэнтыфікацыі карыстальнікаў. Увесь арсенал падрыхтаваны. Калі ўказ будзе прыняты ў такім выглядзе, створацца ўмовы для блакавання рэсурсаў. Не акрэслена пытанне аб сацыяльных сетках і блогах».

# Танны газ у абмен на «Нафтан» і Мытны саюз

**10 снежня Аляксандр Лукашэнка зноў быў у Маскве. Нагода — 10-годдзе падпісання дамовы аб стварэнні саюзнай дзяржавы. З Масквы кіраўнік Беларусі прывёз нізкія цэны на газ і нафту для Беларусі яшчэ на пяць гадоў, а там мусіў пакінуць абяцанне прадаць «Нафтан».**

Лукашэнка з Мядзведзевым пайшлі на рэкорд — іх перамовы працягваліся цэлы працоўны дзень — восем гадзін. З іх у вузкім складзе, за зачыненымі дзвярыма, гутарылі пяць гадзін. Супярэчлівых пытанняў сапраўды хапала.

Візіт у Маскву адбываўся пасля падпісання дамовы аб Мытным саюзе. Сам Лукашэнка афіцыйна сумняваўся, ці не супярэчыць гэтая дамова нацыянальным інтарэсам Беларусі. Нават вядучая аналітычнай перадачы БТ дазволіла сабе ўласную ацэнку мытнага саюза: «Асабіста мне не падабаюцца новыя мыты на аўтамабілі».

Таксама 10 снежня Лукашэнка ўхваліў продаж «БПС-Банка» расійскаму «Сбербанку» за 280,7 млн даляраў. У пачатку 2009 года «БПС-Банк» займаў трэцяе месца сярод беларускіх банкаў па разгалінаванасці філіяльнай сеткі і аб'ёмах прыцягнення ўкладаў насельніцтва, чацвёртае месца — па велічыні активаў.

Можа, менавіта таму беларуская дэлегацыя на перамовах у Маскве заняла пазіцыю «браць Крэмль на змор». Як іранічна зазначыў расійскі «Коммерсант»: «Беларускія чыноўнікі павялі дыскусію паводле загадзя напісанага сцэнару — яны ўзрывалі прадметную размову бясконцымі патрабаваннямі наконт крэдытаў, ільгот, паслабленняў ды выключэнняў. Гэтыя просьбы паўтараліся дзесяткі разоў».

Кіраўнікі ж, каментуючы вынікі перамоваў, абмежаваліся агульнымі фразамі. Мядзведзеў зазначыў, што Расія «праводзіла і будзе праводзіць палітыку, скіраваную на падтрымку беларускай эканомікі». Лукашэнка запэўніваў, што саюзная дзяржава — «не хімера, а рэальнае і найбольш прасунутае інтэграцыйнае фармаванне на постсавецкай прасторы».

А пасля вяртання Лукашэнкі ў Мінск пачала прасочвацца канкрэтыка. Прычым агучваў яе не сам кіраўнік дзяржавы, а віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. Беларусь і Расія адсоўваюць пераход на роўнадаходныя цэны на газ на 2015 год, заявіў чыноўнік, адзначыўшы, што «такая добрая воля і з боку прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева, і з боку прэм'ер-міністра Уладзіміра Пуціна на сустрэчы была выказаная».

Гэта значыць, што ў 2010 годзе Беларусь можа атрымаць газ па нізкіх цэнах. Сёлета сярэдняя цана на газ для Беларусі складае 146 даляраў за тысячу кубаметраў.

За што такія саступкі? Са словаў Сямашкі можна зразумець і гэта. Прыватызацыя комплексу «Нафтан-Палімір» з удзелам расійскіх кампаніяў адбудзецца найбліжэйшым часам, паведаміў віцэ-прэм'ер.

«Расійскія нафтавыя кампаніі нас у гэтым выпадку найлепш задавальняюць», — так У.Сямашка тлумачыў, чаму менавіта Расіі можа быць прададзенае ключавое прадпрыемства нафтаперапрацоўчай галіны.

Расійцы даўно хочуць набыць «Нафтан». І кіраўнік Беларусі гэтым неаднойчы карыстаўся. Дый ціпер казаць з пэўнасцю, што прадпрыемства прададуць, не выпадае. Напрыклад, у навінах тэлеканала СТВ жаданне Расіі прыдбаць завод назвалі «шантажом».

Выглядае, што ў Маскве Лукашэнка ў абмен на сваю лаяльнасць заручыўся падтрымкай расійскага кіраўніцтва на бліжэйшы год, калі не на пяцігодку. І ягоную новую перадвыбарчую кампанію таксама аплаціць Масква.

**Зміцер Панкавец**

## КАМЕНТАР

### Дзе бывае танны газ?

Расія ахвотна ідзе на значныя фінансавыя страты, вызначаючы для Беларусі ніжэйшыя цэны на газ і нафту. Здавалася б, прадавай па рынкавай цане. Чаго расшчодрылася? Расія плаціць сёння, а зыск хоча хочa мець на дзесяцігоддзі. Мытны саюз прывязвае беларускую эканоміку да расійскай. Маючы льготы на газ, беларусы адначасова вымушаны будуць купляць нізкаякасныя расійскія аўтамабілі і пусціць драпежны бізнэс у сваю эканоміку. Ужо ў першай палове 2009-га больш за 80% прамых замежных інвестыцый у беларускую эканоміку прыйшло з Расіі. А хто інвесуе, той і заказвае музыку. Такі вось выходзіць славянскі базар.

**Барыс Тумар**

# Павел Севярынец: Хлусня і беззаконне

**9 снежня Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя.**

Мінюст пабачыла недакладнасці ў звестках аб рэгіянальных сходах заснавальнікаў партыі. Прыводзяцца прыклады з Гарадка, Полацка, Быхава і іншых гарадоў. Мінюст цвердзіць, што людзі, чые прозвішчы стаяць у пратаколах сходаў, не з'яўляюцца заснавальнікамі БХД.

Гэта ўжо другая сёлета адмова БХД у рэгістрацыі. Першая была ў красавіку. Прычыны — тыя самыя, толькі названыя людзі іншыя.

«Хлусня і беззаконне. Сяброў партыі апытвалі супрацоўнікі КДБ, ідэалагічных упраўленняў гарвыканкамаў, дырэктары прадпрыемстваў, але толькі не работнікі Мінюста. Хлуснёй ёсць, што апыталі ўсяго 70 чалавек. Толькі намі было зафіксавана каля 200 такіх тэлефонных званкоў сябрам партыі», — кажа сустаршыня хадэкаў П.Севярынец. «Мы пакуль не маем рашэння, ці трэба нам зараз рэгістрацыя», — зазначае



іншы сустаршыня Аляксей Шэін.

«Улады не могуць зразумець, як у сённяшніх умовах ціску і рэпрэсій дзве тысячы чалавек здольныя арганізаваць цэлую партыю. Радуе, што дзесяткі людзей вытрымалі ціск на працы і не адмовіліся ад подпісаў», — працягвае П.Севярынец.

БХД мае намер актыўна ўдзельнічаць у мясцовых выбарах, а таксама ўзяць удзел у прэзідэнцкіх. Нагадаем, кандыдатам ад партыі на прэзідэнцкія выбары быў вылучаны Віталь Рымашэўскі.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Прысуд прадпрымальніку Бандарэнку адмянілі

Судовая калегія Мінскага гарадскога суда адмяніла прысуд Першамайскага раённага суда адносна прадпрымальніка Андрэя Бандарэнкі. Прычына — не разгледжаныя ўсе матэрыялы справы. Мера стрымання Бандарэнку пакінутая без зменаў — ён знаходзіцца ў Бабруйскай калоніі.

### «Белсату» не далі электрычнасці

Святкаванне двухгоддзя тэлеканала «Белсат» у мінскім клубе «Графіці» сарвалася з-за збою ў электрасетцы. Такая ж сітуацыя была і летась. МЗС Беларусі двойчы адмаўляла тэлеканалу ў адкрыцці карэспандэнцкага пункта ў краіне. Апошнюю адмову канал атрымаў 8 снежня.

### Мартынаў наведае Іспанію і Аўстрыю

Кіраўнік МЗС Беларусі Сяргей Мартынаў 16—18 снежня наведае Аўстрыю з рабочым візітам. Міністр правядзе перамовы са сваімі калегамі Мігелем Марагінасам і Міхаэлем Шпіндэлегерам.

**ЗП**

# Ашчадзяць на ўсіх, апроч міліцыі

**У 2010 годзе скароцяцца выдаткі нават на органы дзяржаўнай бяспекі і праўладныя СМІ.**

Выдаткі кансалідаванага бюджэту Беларусі на 2010 год складуць 55,7 трыльёна рублёў (каля 19,5 мільярдаў даляраў).

Асаблівасцю 2010 года стане тое, што кансалідаваны і рэспубліканскі бюджэт — гэта ўжо не адно і тое ж. Цяпер фонд сацыяльнай абароны насельніцтва выдзелены ў асобную структуру. Яна будзе існаваць асобна ад рэспубліканскага бюджэту, але ўлічвацца ў кансалідаваным. На сацыяльную абарону — пераважна пенсіі — выдаткоўваецца трацінa ад ўсіх грошай, каля 18 трыльёнаў рублёў.

## Дзяржбяспека недаатрымае

Па тым, як размяркоўваюцца астатнія фінансы, можна вызначыць прыярытэты беларускай улады.

Міліцыя — наша ўсё. Толькі органы ўнутраных справаў атрымаюць налета болей, чым было сёлета. Дзяржава «падкінула» міліцыянтам яшчэ $30 млн. Цяпер у тых будзе 1,1 трыльёна рублёў ($385 мільёнаў). Для нагляднасці наступныя лічбы будуць падавацца менавіта ў пераводзе на валюту — у трыльёнах рублёў цяжка разабрацца.

На КДБ дзяржава будзе ашчаджаць — замест $85 млн, як было ў 2009 г., ім дастанецца «ўсяго» $69 млн.

Узброеным сілам таксама абрэзалі: $515 млн. У гэтым годзе было $574.

## Адукацыі — менш, чым войску

Міністр фінансаў Андрэй Харкавец радасна паведаміў, што выплаты на медыцыну і адукацыю павялічацца на 6—7%. Тым не менш, супастаўленне лічбаў пераконвае ў адваротным. Канкрэтны прыклад у рублях — у законе «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2009 год» на адукацыю выдзелена 1,77 трлн рублёў. На 2010 год запланавана выдаткаваць 1,4 трлн. На 21% менш! А калі пералічыць суму ў валюце, то выходзіць яшчэ мацней. З $622 млн да $491 млн адпаведна.

Падобная сітуацыя і з медыцынай. Было $540 мільёнаў — стала $442.

У напружаным спаборніцтве між спортам і культурай ініцыятыву перахапіла сіла. Летась культура была наперадзе — 85 супраць 80 (у мільёнах даляраў). Цяпер фізкультура і спорт адыграліся. Яны атрымаюць $65 млн, на духоўнае ж выдаткоўваецца $63 млн.

## Апошнюю кашулю дыпламатам

Яшчэ адна ахвяра эканамічнага крызісу — праўладныя СМІ. У іх адабралі $8 млн. Здаецца, шмат, але на падтрымку лукашэнкаўскіх газет і тэлеканалаў падаткаплатнікі ўсё адно аддадуць аж $59 мільёнаў.

Эканомія кіраўніка дзяржавы на сабе не такая вялікая. Ад сёлетніх $12 млн, выдаткаваных на «дзяржаўныя органы, якія забяспечваюць дзейнасць прэзідэнта», засталося 10 млн.

Як і летась, унёскі ў саюзную дзяржаву практычна роўныя выдаткам на ўтрыманне дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі ва ўсім свеце. І тыя, і тыя ўсё растуць — $60 млн і $65 млн адпаведна.

Варта адзначыць, што бюджэт на 2009 год дадаткова пераглядаўся ў маі гэтага года ў бок паніжэння. Хто ведае, ці ўдасца выканаць бюджэт-2010, калі запланаванага эканамічнага росту дасягнуць не ўдасца.

**Ягор Марціновіч**







**Пракаповіч: Сярэдняя зарплата бюджэтнікаў — 1,2 млн рублёў**

У 2010 годзе сярэдняя зарплата ў бюджэтнай сферы складзе прыкладна 1,2 млн. рублёў, паабяцаў старшыня праўлення Нацбанка Беларусі Пётр Пракаповіч.

«Для гэтага прадугледжваецца з улікам памесячнай дынамікі даходаў бюджэту павышаць памер тарыфнай стаўкі першага разраду і зарплату з 1 студзеня, з 1 красавіка, з 1 ліпеня і з 1 кастрычніка», — сказаў Пракаповіч.

Як падкрэсліў Пракаповіч, словы якога прыводзіць прэс–служба прэзідэнта, 2010 год — гэта пачатак карэннай перабудовы і мадэрнізацыі эканомікі краіны.

Паводле звестак Белстата, у студзені—кастрычніку 2009 года сярэдняя зарплата ў ахове здароўя склала 767 тыс. руб., у сферы фізкультуры і спорту — 1 277 тыс., сацыяльнага забеспячэння — 577 тыс., адукацыі — 689 тыс., культуры — 723 тыс., навукі — 1 337 тыс.

**БелаПАН**

# У Мінску новага жылля стане меней, а каштаваць яно будзе болей

**Прычына — тэмпы будаўніцтва адсталі на 20% ад запланаваных.**

Пра тое, што жылля ў сталіцы будуць будаваць менш, заявіў дырэктар КУП «Мінскграда» Аляксандр Пятроў. Ён заўважыў, што замест уводу ў эксплуатацыю 2 млн квадратных метраў жылля (як планавалася раней), у Мінску будзе штогод будавацца 1,2 млн квадратаў.

Рашэнне тлумачыцца пасіўнасцю шэрагу забудоўшчыкаў, перадусім камерцыйнага жылля. Дырэктар агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Уладзімір Давыдавіч мяркуе, што пры цяперашніх умовах крэдытавання і фінансавых магчымасцях насельніцтва немагчыма будаваць шмат жылля. Каб шмат будаваць, неабходна, каб новае жыллё хтосьці купляў. Аднак насельніцтва праз аб'ектыўныя прычыны няздольнае забяспечыць устойлівы попыт на кватэры.

Але нават 1,2 млн метраў жылля ў год — сур'ёзны паказчык для сталічных забудоўшчыкаў. Сёлета Мінск безнадзейна адстае ад выканання гадавога задання па будаўніцтве. Паводле дадзеных Белстата, за студзень-лістапад гадавое заданне выканана толькі на 59,6%. З запланаваных 1,4 млн кв. метраў у эксплуатацыю ўведзена толькі 834,9 тысячы.

Прычынай адставання, апроч падзення пакупніцкай здольнасці, эксперты лічаць недахоп будаўнічых магутнасцяў. «Доўгі час сур'ёзных аб'ёмаў будаўніцтва ў сталіцы не стваралася. Усё ішло па шляху інтэнсіфікацыі матэрыяльнай базы, з яе ўжо практычна ўсё выціснулі», — яшчэ ў ліпені заявіў начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Горваль. Яшчэ адной праблемай, на яго думку, з'яўляецца недахоп плошчы, «каб будаваць такія вялізарныя жылыя масівы».

Гэтыя ж праблемы агучыў на нядаўнім сумесным пасяджэнні палат нацыянальнага сходу віцэ-прэм'ер Віктар Бура. Ён канстатаваў, што сітуацыя з невыкананнем планаў па будаўніцтве жылля ў Мінску ўжо сістэмная: «Сёння працы на шэрагу аб'ектаў вядуцца толькі ў адну змену, а на некаторых аб'ектах наогул не вядуцца».

**Андрэй Кажамякін, naviny.by**

## СЦІСЛА

### Першы брэсцкі гіпермаркет

У Брэсце на адной з цэнтральных вуліц — Маскоўскай — адкрыўся гіпермаркет «Карона». Праект рэалізаваны мінскім ААТ «Табак-Інвест». Плошча гіпермаркета 22 тыс. кв. м, на якой размешчаны 75 тыс. найменняў тавараў. «Карона» стварыла больш за 1000 працоўных месцаў.

### «Аська» стане расійскай

Кампанія AOL, якой належыць ICQ («аська») — сервіс абмену паведамленнямі ў інтэрнэце, — вядзе перамовы наконт продажу праграмы расійскай інвестыцыйнай кампаніі Digital Sky Technologies. Сума здзелкі — $200—300 млн. Месячная аўдыторыя ICQ ацэньваецца ў 40—50 мільёнаў актыўных карыстальнікаў.

### У бабулек канфіскуюць грыбы і шкарпэткі

Міністэрства па падатках і зборах прапануе канфіскаваць тавар у нелегальных прадаўцоў. Падаткавікам не падабаецца актыўны гандаль ля падземных пераходаў і гандлёвых цэнтраў. У асартыменце — адзенне, біжутэрыя, садавіна. Пакуль пры затрыманні прадаўцы павінны толькі выплаціць штраф, а тавар вяртаецца ім назад.

### Еўрасаюз знішчыць латвійскія шпроты

Еўракамісія прапанавала знізіць нормы ўтрымання дыяксіну і бензапірэну ў шпротах. Калі рашэнне будзе прынята, латвійскія вытворцы шпротаў збанкрутуюць. У выпадку паніжэння нормы дыяксіну з ужытку могуць быць выключаныя ўсе віды рыбы, што здабываюцца ў Балтыйскім моры. А зніжэнне бензапірэну азначае, што ўся вэнджаная рыба будзе забароненая, шпроты ў тым ліку.

### Расія выпусціць беларускія еўраблігацыі

Арганізатарам іх выпуску стане «Сбербанк» Расіі. Еўрапейскія аблігацыі складуць $2 млрд, а тыя, што будуць арыентаваныя на расійскі рынак, — каля $500 млн. Пра гэта віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка дамовіўся на сустрэчы з кіраўніком расійскага «Сбербанка» Германам Грэфам.

### Наступнае павелічэнне пенсій — праз паўгода

Нацыянальны сход ухваліў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонда сацыяльнай абароны на 2010 год. Павелічэнне пенсій чакаецца з 1 жніўня. Рост сярэдняга памеру пенсіі мае складці 18,6%.

### АЭП Бел-Рас-Каз плануецца сфармаваць не пазней за 1.01.2012

Паводле вынікаў пасяджэння Міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС, якое адбылося 11 снежня ў Санкт-Пецярбургу, кіраўнікі ўрадаў падпісалі 19 дакументаў, у тым ліку звязаных з уводам у дзеянне Мытнага саюза Беларусі, Расіі, Казахстана. Гаворка таксама ішла аб праекце плана дзеянняў па фармаванні адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана. Прэм'ер-міністр Казахстана заявіў, што яна з'явіцца не пазней за 1 студзеня 2012 года.

**ЯМ**



# Новы год і Каляды: аграсядзібы запрашаюць

Пакатацца на санках і санях, пакоўзацца на каньках вакол ялінкі, пасмажыць шашлыкі, пагрэцца ля сапраўднай печы — гэта і шмат чаго іншага прапануюць беларускія аграсядзібы на зімовыя святы.

Аматарам сустрэць Новы год ва ўтульным вясковым дамку варта паспяшацца. «Не ўгадаў я сёлета з цаной — у мяне дамок на дзесяць чалавек на суткі каштуе мільён рублёў, а ў канкурэнтаў тыя ж паслугі каштуюць ад паўсотні даляраў на чалавека», — кажа гаспадар сядзібы «Ля Свяцка», што за 18 км ад Гродна, Рыгор Яроменка. Ён прапануе гасцям стравы беларускай, польскай і літоўскай кухні. У доме ёсць усе зручнасці. Для тых, хто жыве не хлебам адзіным, — за якую сотню метраў ад сядзібы знаходзіцца палац Валовічаў XVIII ст.

### Родныя куты запрашаюць

Сядзіба «Родны кут» Юліі і Юрыя Бука ў Глыбоцкім раёне, дзякуючы водгукам у прэсе, цяпер не мае праблемаў з наведнікамі. Нагадаем, яны робяць зніжку для беларускамоўных. Сюды можна наведацца пасля 1 студзеня, на зімовыя вакацыі. Цэны ад лета не змяніліся — суткі пражывання ў найлепшай з хатак, дзе ёсць санвузел, газавая пліта, лядоўня, посуд і тэлевізар, каштуе 15 тысяч рублёў з чалавека.

Свой «Родны кут» ёсць у Мінскім раёне, у вёсцы Валоўшчына. «На Новы год у нас памяшканне замаўляюць за 2—3 месяцы — і цяпер занялі. Але прыязджайце да нас на каву ў любы час», — запрасіў гаспадар сядзібы Уладзімір Судас. Узімку ў ягонай хатцы могуць змясціцца шэсць чалавек. Тут маецца печ з ляжанкай, камін, лазня. Гасцям прапануецца сялянская ежа.

### Па мясцінах Івонкі Сурвілы

За 60 кіламетраў ад сталіцы, на мяжы вёсак Зарэчча і Засулле, размясцілася сядзіба «Зарачанскія Яніны». Для гасцей — двухпавярховы дом з жылымі пакоямі, кухняй, душам, саўнай, прыбіральняй і залай з тэлевізарам. Гаспадары пачастуюць мачанкай, бабкай ды іншымі стравамі нацыянальнай кухні. У мастацкай майстэрні кожны ахвочы можа паспрабаваць свае здольнасці.

Ад 3 да 6 студзеня, а таксама пасля 7-га, чакае аматараў вясковага адпачынку сядзіба «Верагі» на Лагойшчыне. На Новы год і калядную ноч сядзібу ўжо занялі. «Арэнда пакояў ад 150 да 250 тысяч», — кажа гаспадар Анатоль.

### На каньках вакол ялінкі

Сядзіба «Гасцінны двор» на Быхаўшчыне спецыялізуецца на паляванні. Аднак і для аматараў больш мірнага адпачынку можа шмат чаго прапанаваць: пакатацца на санках і санях, пакоўзацца на каньках вакол ялінкі (каток акурат пачалі заліваць), а то і ў хакей згуляць, пацерацягваць канат і на лыжах прабегчыся. У ваколіцах вёскі аднаўляецца жаночы кляштар XVIII ст., дзе знаходзіцца Баркалабаўская цудатворная ікона Божай Маці. Сядзіба з усімі зручнасцямі змяшчае да 20 чалавек. Цэны — ад ста тысяч рублёў за пакой на 4—5 чалавек.

«Наш брэнд — кузня і Блакітныя азёры», — кажа гаспадар сядзібы «Трабуцішкі» на Пастаўшчыне Юрый Фурс. Першы навагодні тыдзень забраніравалі за некалькі месяцаў наперад. Гасцей пакатаюць на санях, папараць у лазні, пачастуюць нацыянальнымі стравамі. У ваколіцах ёсць што паглядзець — Лынтупскі і Камайскі касцёлы, панскія сядзібы ў Паставах, Лынтупах, Камарове, старажытныя млыны і дзоты Першай сусветнай, сядзіба вядомага беларускага мастака Альфрэда Ромера.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Сямён Печанко**

**«Ля Свяцка»**
Гродзенскі раён, Крулеўшчына, 7
Т.: (44) 772–15–83
e–mail: sviatsk@tut.by
Рыгор Яроменка

**«Зарачанскія Яніны»**
Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён,
в. Зарэчча, вул. Цэнтральная, д.105.
Т.: (29) 643–43–02; (29) 566–43–02
Паваротны Аляксандр

**«Родны кут»**
Віцебская вобласць, Глыбоцкі раён,
в.Валодзькава
Т.: (02156) 3–63–57; (29) 109–51–89
Юлія Бука

**«Родны кут»**
Мінскі раён, в.Валоўшчына,
зав.Лясны, 2
Т.: (29) 641–47–62
Уладзімір Судас

**«Верагі»**
Мінская вобласць, Лагойскі раён,
в.Верагі
Т.: (29) 656–41–34, (29) 274–76–83

**«Гасцінны двор»**
Магілёўская вобласць, Быхаўскі раён, в.Залахвенне,
вул.Цэнтральная, 29
Т.: (44) 773–31–37, (29) 740–26–26, (02231) 3–23–05
Міхаіл Дудзікаў

**«Трабуцішкі»**
Віцебская вобласць, Пастаўскі раён, в.Трабуцішкі
Т.: (29) 668–02–77, (29) 553–29–88, (02155) 4–44–32
e–mail: fursy@mail.ru
Юры Фурс

## Пасля «Анастасіі Слуцкай» — «Еўфрасіння Полацкая»

**«Беларусьфільм» плануе зняць карціну са статусам «нацыянальнага фільма».**

Пра гэта заявіў першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка. Ужо адабраныя шэсць тэмаў гістарычнага характару, якія могуць скласці аснову «нацыянальнага фільма».

У іх ліку — ідэя зрабіць экранізацыю аднаго з найбуйнейшых твораў Уладзіміра Караткевіча і сцэнар, прысвечаны жыццю Еўфрасінні Полацкай.

Да канца 2010 года плануецца зацвердзіць сцэнар «нацыянальнага фільма». Як адзначыў Рылатка, «Настасся Слуцкая» «з розных прычын» не зусім адпавядае статусу «нацыянальнага фільма».

Паводле словаў галоўнага рэдактара кінастудыі Наталлі Сцяжко, праект знаходзіцца пад патранажам кіраўніка дзяржавы, і, перш чым прапанаваць яму штосьці на зацвярджэнне, на «Беларусьфільме» павінны быць пэўныя, што «гэта сапраўды будзе нацыянальны праект». На якой мове будзе той «нацыянальны праект» — невядома.

**БелаПАН, СМ**

## Фільм паводле «Чарнобыльскай малітвы» прэтэндуе на «Оскар»

**«Дзверы» («The Door») — дэбютная рэжысёрская праца прадусаркі і акторкі з Ірландыі Хуаніты Уілсан.**

Мастацкі фільм паводле рамана Святланы Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» пазмагаецца за «Оскара» ў катэгорыі «найлепшы караткаметражны мастацкі фільм».

«Дзверы» («The Door») — дэбютная рэжысёрская праца прадусаркі і акторкі з Ірландыі Хуаніты Уілсан. У аснову сюжэта пакладзены «Маналог пра цэлае жыццё, напісаны на дзвярах» — гісторыя з кнігі «Чарнобыльская малітва» Святланы Алексіевіч. Герой стужкі — Мікалай Калугін, у якога ад радыяцыі памірае дачка. Каб пахаваць дзяўчынку, герой выпраўляецца ў Чарнобыльскую зону.

Фільм ствараўся ў Прыпяці, за некалькі кіламетраў ад рэактара. У «Дзвярах» іграюць акторы Ігар Сігаў (Тэатр беларускай драматургіі) і Джульета Казакевіч-Герынг (маскоўскі тэатр Школа сучаснай п'есы).

82-я цырымонія ўручэння прызоў амерыканскай Акадэміі кінамастацтваў адбудзецца 7 сакавіка 2010 г. у Галівудзе.

**ЛК, Антон Тарас**

## СЦІСЛА



У Мінску на вуліцы Машынабудаўнікоў пры раскідванні пясчана-саляной сумесі пашкоджаныя тры дзясяткі аўто. У сумесь выпадкова трапілі камянюкі. УП «Рэмаўтадар Заводскага раёна Мінска» абяцае кампенсаваць уладальнікам машын шкоду.

### Загінуў, уцякаючы ад ДАІ

У Брэсце забіўся 23-гадовы вадзіцель. Ён не справіўся з кіраваннем і ягоны «Фольксваген-Гольф» ударыўся ў прыдарожную агароджу. Вадзіцель памёр, так і не апрытомнеўшы, у абласной бальніцы. Гэты кіроўца раней быў пазбаўлены правоў за кіраванне аўтамабілем п'яным.

### Мінчук павесіўся ў Лошыцкім парку

12 снежня ў Лошыцкім парку на дрэве быў знойдзены труп 26-гадовага мінчука. Труп знайшоў брат павешанага. У перадсмяротнай запісцы нічога канкрэтнага пра прычыны сыходу з жыцця самагубца не паведаміў. Па ім засталіся жонка і дачка.

### Курсант шантажаваў прастытутак

Курсант Акадэміі міліцыі вырашыў падманам атрымаць ад дзвюх мінскіх прастытутак 280 тысяч рублёў, пагражаючы прыцягнуць іх да адказнасці за іх заняткі. Тыя самі наскардзіліся ў міліцыю. Прадпрымальнага курсанта ўзялі пасля атрымання грошай. Заведзеная крымінальная справа.

### Дыпламат гандляваў калготкамі

Першы сакратар пасольства Швецыі ў Расіі Андрэс Марцін Форс ездзіў у Беларусь, купляў недарагую панчошна-шкарпэткавую прадукцыю і здаваў яе на рэалізацыю ў расійскія магазіны. Дзякуючы дыпламатычнай недатыкальнасці, Форс пазбягаў праверак на мяжы. Шведскі бок прыняў рашэнне аб спыненні працы Форса ў Маскве.

**БелаПАН, БЕЛТА, «Ежедневник»**

# «Могуць прыставіць пісталет да скроні — ніхто і не заўважыць»

Жорсткае забойства касіркі Таццяны Пятровай паказала, наколькі неабароненыя ў краіне прадстаўнікі гэтай прафесіі.

Забойства 21-гадовай касіркі абменніка ўскалыхнула Мінск. Людзі шакаваныя жорсткай расправай з дзяўчынай. 10 снежня ранкам Таццяна Пятрова прыйшла на працу, у абменнік, што на вуліцы Варвашэні ў сталіцы. У гэты дзень ў Таццяны быў выходны і мусіла працаваць напарніца, але тая папрасіла падмяніць яе...

Кабінка абменнага пункту знаходзіцца на вуліцы, проста ля ўваходу ва ўніверсам «Аўтазаводскі». Калі дакладна адбылося забойства, ніхто не ведае. Увечары інкасатары прыехалі за грашыма і пабачылі ў кабінцы дзяўчыну з перарэзаным горлам. Валюты не было. Міліцыя падлічыла, што знікла 35 мільёнаў рублёў.

Прадавачкі «Аўтазаводскага» згадвалі, што раніцай ля абменніка «цёрся нейкі мужык». Мо ён і падпільнаваў Таццяну ў сярэдзіне дня, калі тая, паставіўшы таблічку «тэхнічны перапынак», выйшла з абменніка.

Магчыма, дзяўчына адмовілася аддаць рабаўніку грошы. У лютым, пасля крадзяжу грошай з абменніка ў адным з гіпермаркетаў, адказнасць усклалі на касірку, якая тады працавала.

Камер назірання, накіраваных проста на абменнік,не было, што робіць раскрыццё справы маларэальным.

Пра меры бяспекі касіраў «НН» расказаў Яўген П., які працуе ў адным з абменнікаў «Беларусбанка».

**«Наша Ніва»: Што ўяўляе сабой сістэма бяспекі абменніка?**

**Яўген П.:** У кабінцы ўсталяваныя металічныя дзверы з дзвюх пласцін (у кватэрах — адна), якія зачыняюцца на чатыры абароты ключа. Тоўстае шкло павінна выратаваць ад страляніны. Але лепш не правяраць...

У большасці абменнікаў усталяваная сігналізацыя, праз якую адбываецца сувязь з міліцыяй. Але ў адной з кабінак, дзе я працаваў — у мінскім супермаркеце, — я бачыў і аўтаномную сігналізацыю. Гэта значыць, калі я націсну кнопку, ніхто не прыедзе на помач. Сігналізацыя проста запішчыць. На гук павінен прыбегчы ахоўнік. Адзін. Але ці дапаможа ён, калі рабаўнікоў некалькі?..

**«НН»: Касіры маюць права выходзіць з кабінкі? Напрыклад, у прыбіральню.**

**ЯП:** У тым самым супермаркеце ў вызначаны час падыходзіў ахоўнік. Я выходзіў, а ён заставаўся ля кабінкі. У іншых абменніках кабінку трэба здаваць на сігналізацыю, як кватэру. Калі вяртаюся — здымаю з аховы, заходжу, а пасля ўключаю ахову знутры.

**«НН»: А калі нехта па дарозе ўдарыць ці ўжыве электрашокер, адбярэ пульт?**

**ЯП:** Вось у гэтым і асноўная праблема... Трэба разлічваць толькі на сваю асцярожнасць. Але ці патэлефануе нехта ў міліцыю, калі ўбачыць незнаёмца ў абменніку, мне будзе ўжо няважна — мяне ж ужо заб'юць... Яшчэ могуць прыставіць пісталет да скроні і зайсці разам са мной. Наўрад ці нехта зверне на гэта ўвагу.

**«НН»: Калі, напрыклад, пачаўся пажар: трэба ратавацца самому ці ратаваць грошы? Што кажуць інструкцыі?**

**ЯП:** У кабінцы ёсць незгаральныя сейфы, туды за 20—30 секунд можна ўсё схаваць. Інструкцый, дзе было б напісана, што даражэйшае — грошы альбо я — няма. Але калі я ўратуюся, зразумела, вяртанне валюты «павесяць» на мяне.

**«НН»: Іншая сітуацыя: нехта грукае ў кабінку, што табе трэба рабіць?**

**ЯП:** Зірнуць у вочка ў дзвярах, далей праз прыёмнік грошай узяць пасведчанне. Асобу трэба праверыць па спецыяльным спісе людзей, якія маюць права доступу ў кабінку. Ні пажарнага, ні міліцыянта, ні электрыка не пусціць. Ім можна адчыніць дзверы толькі тады, калі будзе спецыяльнае пасведчанне, выпісанае дырэктарам банка.

**«НН»: Ці здараліся ў тваёй практыцы нейкія надзвычайныя здарэнні?**

**ЯП:** Я тады працаваў у абменніку ў адным з медцэнтраў. Каб не цягаць з сабой ключы, мы здавалі іх мясцовай ахове. Падыходжу да ахоўніка, а ён кажа: «Дык ужо ўзяў нехта ключы!» У мяне ўнутры ўсё аж перавярнулася. Пабег да кабінкі, а там калега сядзіць. Ён нешта паблытаў і вырашыў, што павінен працаваць у той дзень. Вось і прыйшоў на маё працоўнае месца.

**Падрыхтаваў Ягор Марціновіч**




**Крызіс — год палявання на касіраў і інкасатараў**

Сёлета трагічных здарэнняў як ніколі шмат. У лютым быў абрабаваны абменнік ў гіпермаркеце «Прастор». Злачынца з электрашокерам пад выглядам інкасатара напаў на касірку. Пасля таго, як яна страціла прытомнасць, скраў каля $90 тыс. Злачынцу не знайшлі.

У тым самым лютым на Салігоршчыне быў здзейснены напад на машыну з кіроўцам і эканамістам сельгаспрадпрыемства «Бальшавік Агра». Трое злачынцаў забілі іх і скралі каля $30 тыс. Забойцаў знайшлі, аднаго з іх прысудзілі да смяротнага пакарання.

У верасні ў Віцебску напалі на касірку. Калі яна выходзіла з кабінкі, наваліліся двое невядомых і заштурхнулі назад у абменнік. Было скрадзена каля $20 тыс.

Чэрвеньская спроба рабаўніцтва ў Баранавічах поспеху не прынесла. Няўдалага злачынцу, грамадзяніна Паўднёва–Афрыканскай Рэспублікі затрымала міліцыя.

## З пошты рэдакцыі

* * *

Лукашэнка: «Па тэлевізары глядзець няма чаго...»
...і няма на каго — адны нулі.

**Кнехт, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

FREEВОЛЬНАСЦІ

## Сэкс-турызм па-беларуску

Год ці два таму ў адной мінскай ВНУ быў лакальны скандал, які не дасягнуў медыя-прасторы — такія рэчы ў Беларусі прынята замоўчваць. У гэтай ВНУ навучаецца шмат студэнтаў з арабскіх краінаў. Калі паназіраць за замежнікамі, то можна заўважыць, што студэнты з Кітая заўсёды сустракаюцца паміж сабой — кітайскія хлопцы з кітайскімі дзяўчатамі. Сярод арабаў такой тэндэнцыі няма. Іх больш прывабліваюць нашы «наташы» (так называюць у арабскіх краінах усходніх славянак, гатовых за грошы на ўсё).

Скандал здарыўся, калі кіраўніцтва ВНУ даведалася, што ў інтэрнаце студэнткі-«наташы» стаяць у чарзе ля пакояў арабскіх студэнтаў. Стаяць рэгулярна, заходзяць па чарзе, а пасля выходзяць, рассоўваючы даляры па кішэнях кароценькіх халацікаў. У асноўным гэта былі дзяўчаты з вясковых сем'яў, якім не хапала грошай у дарагой сталіцы. Яны



свядома ішлі зарабляць да арабаў, бо хацелася модна апранацца ды хадзіць па дыскатэках. Самае агіднае ў гэтай гісторыі тое, што чэргі былі рэальна вялікімі і студэнты-арабы, калі ім гэтыя паслугі былі ўжо непатрэбныя, сілай выпіхвалі дзяўчат, якія спрабавалі прабіцца ў іх пакоі.

А адзін мой знаёмы з тымі ж мэтамі ездзіць да бабулі ў вёску. На прывабнага гарадскога хлопца там заўсёды знаходзіцца пару прыгожых вясковых дзяўчат, гатовых на ўсё. Такі вось сэкс-агратурызм па-беларуску.

**Вольга Жарнасек**

# Майкі на кожны густ




У інтэрнэце на сайце tishotka.blog.tut.by прайшоў конкурс на самую лепшую карцінку для майкі, што меў назву «Цішоткі вольных беларусаў» («цішотка» — гэта назва майкі-саколкі на слэнгу). Журы выбірала пераможцаў з сотні працаў ад 44 удзельнікаў.

Вырашана кожнае з трох прызавых месцаў раздзяліць паміж двума ўдзельнікамі, дадаткова вызначаныя тры пераможцы ў намінацыі «Беларуская свабода» ад Руху «За свабоду», чатыры пераможцы ў намінацыі «Будзьма беларусамі», якія атрымаюць памятныя сувеніры ад агульнанацыянальнай культурніцкай кампаніі «Будзьма!» і адзін прыз глядацкіх сімпатый.

Ганарар за першае месца падзялілі Кася Шчірліц і Мікалай З.

Усе ўдзельнікі конкурсу да канца месяца на пазначаныя паштовыя адрасы атрымаюць цішотку з прынтам аднаго з пераможцаў. У бліжэйшы час з пераможцамі і намінантамі звяжуцца арганізатары кампаніі для ўдакладнення спосабаў атрымання ганарараў і падарункаў.



# Майкл Скэнлан:
# ЗША ўхвальна глядзяць на працяг праграмы МВФ stand-by для Беларусі

Гутарка з часовым павераным у справах ЗША ў Беларусі Майклам Скэнланам.

**«Наша Ніва»: Спадар Скэнлан, раскажыце трохі пра сябе. Дзе Вы нарадзіліся, дзе вучыліся? Дзе працавалі перад Беларуссю?**

**Майкл Скэнлан:** Я нарадзіўся ў Вашынгтоне, у сталіцы ЗША. Паколькі мой бацька таксама быў дыпламатам, то я шмат часу ў дзяцінстве праводзіў за мяжой. Я навучаўся ў Джорджтаўнскім універсітэце, у Інстытуце міжнародных зносін. Там я атрымаў ступень бакалаўра. Затым я працаваў у прыватным сектары, каб зарабіць грошы на наступнае навучанне. Ступень магістра я атрымліваў ва ўніверсітэце Тафтс, у Флэтчараўскай школе міжнароднага права і дыпламатыі. Затым я працаваў у Кангрэсе. Але я сумаваў па магчымасці жыць за мяжой. Я хацеў займацца міжнароднымі адносінамі, таму здаў экзамен і ў 29 гадоў пачаў дыпламатычную службу. Пасля гэтага я працаваў у краінах былога Савецкага Саюза, а таксама на Балканах.

**«НН»: А ці бывалі раней у Беларусі?**

**МС:** У 2002—2004 гадах я працаваў у Дзяржпдэпартаменце ЗША ва Упраўленні дапамогі, дзе займаўся ў тым ліку Беларуссю. Але ў той час я не наведваў вашу краіну. Тым не менш, падчас працы ва Украіне, вясной 2008 года на выхадныя прыватна прыязджаў у Беларусь.

**«НН»: Што-небудзь здзівіла ў Беларусі?**

**МС:** Я не магу сказаць, што нешта здзівіла, таму што ўжо даволі добра ведаў гэтую частку свету. Але я быў расчараваны станам адносінаў паміж нашымі краінамі. Шкада, што яны пагоршыліся.

**«НН»: Ці змянілася неяк палітыка Адміністрацыі Барака Абамы ў дачыненні да Беларусі ў параўнанні з палітыкай Адміністрацыі Джорджа Буша-малодшага?**

**МС:** Пазіцыя ЗША заўсёды была паслядоўнай. Прычыны, што прывялі да ўвядзення санкцый, застаюцца. У заяве, змешчанай нядаўна на сайце пасольства, зазначана, што санкцыі прывязаны да сітуацыі з правамі чалавека, выбарамі, свабодай СМІ. Статус-кво спараджае статус-кво. І калі гэтыя з'явы не зменяцца, то санкцыі таксама не будуць зняты. У той жа час мы заўсёды верылі і верым, што нашы адносіны могуць быць шматграннымі. Сёння (14 снежня — «НН») я быў у беларускім МЗС, дзе мы размаўлялі на тэму гандлю людзьмі. Гэта супольная праблема, над вырашэннем якой мы можам супрацоўнічаць. Беларусь шукае магчымасць дасягнуць вельмі добрай мэты — да 2015 года зачыніць усе дзіцячыя дамы і рассяліць дзетак па прыёмных сем'ях ці вярнуць біялагічным бацькам. У нас ёсць праграма дапамогі грамадзянскай супольнасці ў намаганнях садзейнічаць ураду ў рэалізацыі гэтай выдатнай мэты. Здаецца, стане магчымым выдаткаванне на гэта яшчэ каля аднаго мільёна долараў. У Беларусі зараз таксама вырашаецца праблема з сухотамі. Мы аказваем дапамогу і ў гэтай сферы.

**«НН»: Дык а што канкрэтна трэба зрабіць Беларусі, каб былі адменены эканамічныя санкцыі супраць прадпрыемстваў, візавыя — супраць чыноўнікаў?**

**МС:** Пытанне санкцый закранае многа сфераў. І гэта азначае, што трэба вырашаць пытанні з правамі чалавека, з незалежнымі медыямі, выбарамі. Мы віталі той факт, што вясной 2009 года беларускі ўрад уключыўся ў абмеркаванне зменаў у выбарчае заканадаўства з Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Але мы шкадуем, што з таго часу гэты працэс не праходзіў



**Майкл Скэнлан**

Нарадзіўся ў 1961 годзе ў Вашынгтоне. Ступень бакалаўра атрымаў у школе замежных справаў Джорджтаўнскага ўніверсітэта (1984). Ступень магістра атрымаў у школе права і дыпламатыі ўніверсітэта Тафтс (1989). Працаваў у Кангрэсе. Ад 1991 года на дыпламатычнай службе. Працаваў у Вялікабрытаніі, Казахстане, Кыргызстане, Арменіі, Харватыі, Расіі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіне, Украіне. У Беларусь у якасці часовага паверанага прыбыў 30 чэрвеня 2009 года. Валодае англійскай, баснійскай, сербскай і расійскай мовамі. Вывучае беларускую.

адкрыта і празрыста, каб грамадства таксама было ўключанае ў абмеркаванне. Яшчэ адно пытанне — гэта артыкул 193.1 Крымінальнага кодэкса «Дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі». Нават кіраўніцтва Беларусі кажа, што трэба нешта змяняць, але зменаў няма. Не рэгіструюцца палітычныя партыі, з праблемамі сутыкаюцца недзяржаўныя арганізацыі. Мы з задавальненнем успрынялі той факт, што ў 2008 годзе дзве незалежныя газеты атрымалі доступ да афіцыйнай сістэмы распаўсюду, але яшчэ 12 выданняў такой магчымасці не маюць. Мы вітаем ужо зробленае, і гэта адлюстроўваецца ў нашых рашэннях у адказ. Маецца на ўвазе, што пасля вызвалення палітвязняў мы прыпынілі санкцыі супраць двух прадпрыемстваў «Белнафтахіма».

**«НН»: Калі можа быць адноўлена паўнавартасная праца дыпламатычных місій Беларусі і ЗША? Ці хапае зараз амерыканскіх дыпламатаў для выканання імі сваіх службовых паўнамоцтваў?**

**МС:** Гэта пытанне не да нас, а да беларускага ўрада. Цяпер нам дазволена мець толькі пяць дыпламатаў. Да таго ж, мы не маем магчымасці выязджаць далей чым за 40 кіламетраў ад Мінска, не папярэдзіўшы загадзя беларускія ўлады. Першыя шэсць месяцаў свайго знаходжання ў Мінску я займаўся тым, што арганізоўваў працу пасольства з улікам таго, што нам, магчыма, прыйдзецца працаваць у такім складзе яшчэ нявызначаны час. Але мы адкрытыя да дыялогу. Мы зацікаўленыя ў развіцці супрацоўніцтва ў многіх сферах, але для гэтага патрэбная большая колькасць супрацоўнікаў пасольства. Я прашу прабачэння ў беларусаў, якія вымушаны ехаць у Кіеў, Маскву, Санкт-Пецярбург, каб атрымаць амерыканскую візу. На жаль, сённяшняя колькасць дыпламатаў не дазваляе нам рабіць гэтыя паслугі. Але мы размаўляем на гэтую тэму з беларускімі ўладамі.

**«НН»: Сканчваецца першая крэдытная праграма МВФ для Беларусі. Улады не хаваюць, што зацікаўлены ў наступнай. Якое стаўленне займае па гэтым пытанні ЗША?**

**МС:** Мы думаем, гэта добра, што Беларусь супрацоўнічае з МВФ і Сусветным банкам. Калі Беларусь кажа пра шматвектарную эканоміку, пра яе дыверсіфікацыю, пра інтэграцыю ў сусветную, то такое супрацоўніцтва вельмі важнае. МВФ і Сусветны банк з'яўляюцца добрымі дарадцамі ў гэтым працэсе. Праграма stand-by сканчваецца ў красавіку. І ЗША ўхвальна глядзяць на магчымасць працягу гэтай праграмы. Мы лічым, што гэта вельмі добра для Беларусі.

**«НН»: Нядаўна скончылася дзеянне Будапешцкага мемарандума, пад якім у свой час падпісаліся ЗША. Штаты будуць працягваць з'яўляцца гарантам бяспекі нашай краіны ў будучыні?**

**МС:** Па гэтым пытанні была афіцыйная заява Дзяржпдэпартамента. Яна тычыцца не толькі Беларусі, але і Казахстана з Украінай. ЗША і Расія пацвярджаюць, што ўмовы гэтага мемарандума будуць дзейнічаць і пасля 4 снежня.

**«НН»: Беларускія ўлады часта кажуць, што зацікаўленыя ў заходніх інвестыцыях у краіну. А дзе вы бачыце перспектыву для амерыканскіх інвестыцыйных праектаў у Беларусі?**

**МС:** Своечасовае пытанне. Наколькі я ведаю, беларускі ўрад прыняў бюджэт на 2010 год, у якім запланавана прыцягнуць 5 мільярдаў найпраставых замежных інвестыцый. Для ўсіх эканомік у свеце (і ЗША тут не выключэнне) важна забаўляваць замежныя інвестыцыі. У рэкамендацыях МВФ і Сусветнага банка таксама адзначаецца неабходнасць стварэння такога клімату, які будзе спрыяць замежным інвестыцыям. Калі мы возьмем пытанне прыватызацыі, то неабходна, каб яна праходзіла празрыста і адкрыта, каб гэтая сістэма выклікала давер. Мы зацікаўленыя і гатовы спрыяць павелічэнню прыватнага сектара ў беларускай эканоміцы. У прыватнасці, развіццю малога і сярэдняга бізнэсу. Як правіла, амерыканскія кампаніі не звяртаюцца да амерыканскага ўрада — яны самастойна распараджаюцца сваім капіталам. Мы можам дапамагаць усталёўваць кантакты, але не наша роля вызначаць, каму і куды ўкладваць свае грошы.

**«НН»: Зноў да прыватнага. Якое ў Вас хобі? Чым займаецеся ў Мінску?**

**МС:** Я футбольны фанат. За час знаходжання ў Беларусі прагледзеў дзесяці шэсць матчаў. Каманда ЗША ўжо прайшла кваліфікацыю на чэмпіянат свету ў Паўднёвую Афрыку. Нам пашанцавала з лёсаваннем. Мы цяпер жартуем з брытанцамі, што зборнай Англіі не пашанцавала быць з намі ў адной групе. Гуляю ў тэніс. Спрабую рабіць гэта два разы на тыдзень. Хаджу ў басейн. Імкнуся не адмяняць заняткі, але гэта вельмі складана праз мой працоўны графік. Рады, што пайшоў снег, бо вельмі люблю катацца на лыжах. Паспрабую сноўбордзінг, бо ім лепш пачынаць займацца на нізкіх схілах. Таксама буду сачыць за беларускімі баскетбольнымі камандамі. Я вельмі люблю спорт. Улетку я ўвесь час катаўся на роварах, нават дабіраўся на ім да працы.

**«НН»: А за якую футбольную каманду перажываеце?**

**МС:** Складанае пытанне. Не магу адказаць так, каб нікога не пакрыўдзіць. Мне спадабалася гульня БАТЭ ў еўракубках. Я прысутнічаў на іх гульні з латвійскім «Вентспілсам» у Барысаве. Мне спадабалася назіраць за гульнёй зборнай Беларусі. Трэба прызнацца, калі сюды прыехала ўкраінская каманда, то мне было вельмі складана вызначыцца.

**«НН»: А як Вам беларуская кухня?**

**МС:** Я такі чалавек, што вырас на мясе з бульбай. Але тут можна замаўляць не толькі беларускую кухню. Паколькі я з краіны, дзе ў адным катле аказалася вельмі шмат нацый, то мне падабаецца разнастайнасць і магчымасць выбіраць.

**«НН»: Беларускую мову будзеце вывучаць?**

**МС:** Як вы бачыце, я ўжо крыху яе разумею. Гэта першы крок. Але першыя месяцы маёй працы тут былі занятыя, як я ўжо казаў, рэарганізацыяй працы пасольства. У 2010 годзе планую перайсці з пасіўнага ўспрымання беларускай мовы да яе рэальнага ўжывання. Але шчыра скажу, што я ніколі не змагу размаўляць так, як Стэфан Эрыксан [пасол Швецыі — Рэд.]! Яго валоданне беларускай мовай уражвае.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Брусэльскія размовы «не пад запіс»

**Пытанне незалежных журналістаў было зададзенае ў лоб: «Кіраўнік Беларусі мае грашовыя актывы за мяжой?». Рэпартаж Вольгі Жарнасек з офіса Еўрасаюза.**



Візіт беларускіх журналістаў у Брусэль прыпаў на час, калі стала вядома, што санкцыі супраць Беларусі прыпыненыя, але не скасаваныя. Мінуў год, як Еўропа распачала дыялог з Аляксандрам Лукашэнкам. Год, як распачаўся «перыяд лібералізацыі».

Наш «працоўны візіт» фармальна азначаў знаёмства журналістаў са структурай Еўрапейскага саюза, сэрца якога знаходзіцца ў Брусэлі, нефармальна — шэраг сустрэч з прадстаўнікамі Еўрапейскай Камісіі, якія не толькі адказвалі на нашыя пытанні, але і задавалі свае. Многія размовы вяліся «off the record» («не пад запіс») — абавязковае правіла, якое нам паралі ні ў якім разе не парушаць.

## За адным сталом, але па розныя бакі

Запрашэнне ўзяць удзел у паездцы атрымалі як прадстаўнікі незалежных, так і прадстаўнікі дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Раскладка была 2/1 — дзесяць журналістаў з незалежных СМІ і пяць журналістаў з дзяржаўных: прадстаўнікі газет «Советская Белоруссия», «Рэспубліка», тэлеканала БТ, агенцтва БелТА і Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.

Адносіны паміж гэтымі дзвюма групамі былі прадказальныя. На адным з працоўных абедаў, калі за сталом разгарэлася спрэчка наконт цяжкасцяў атрымання віз, прадстаўнік Еўракамісіі спытаў: ці праўда, што з аднаго боку стала сядзяць прадстаўнікі дзяржаўных СМІ, а з другога — незалежных? Яго сапраўды здзівіла, што падзел настолькі відавочны.

Пытанне візаў стала своеасаблівым козырам у руках праўладных журналістаў. Яны скардзіліся на тое, як цяжка атрымаць звычайнаму беларусу хаця б аднаразовы «шэнген», праз якую колькасць здзекаў яму прыходзіцца прайсці, нарэшце, як шмат беларусы плацяць за візы. Еўрапарламентары ў сваю чаргу тлумачылі, чаму адбываецца так, а не інакш. Палягчэнне візавага рэжыму, казалі яны, стане чарговым крокам у адказ на лібералізацыю ў Беларусі, але авансам яны гэта зрабіць не могуць.

## Вока за вока

Было відавочна, што жывём мы ў розных краінах пад адной назвай «Беларусь». І не толькі журналісты. Выдатна гэтую сітуацыю праілюстравала сустрэча з прадстаўнікамі беларускай амбасады ў Брусэлі Аляксандрам Самусенкам і Аляксеем Самасуевым ды з кіраўніцай Офіса «За дэмакратычную Беларусь» Вольгай Стужынскай.

Самусенка ў сваёй прамове даў крытычную ацэнку развіццю беларуска-еўрапейскіх адносін. «Поўнай задаволенасці мы не адчуваем, нягледзячы на істотныя пазітыўныя зрухі на працягу 2008—2009 гадоў, — заявіў ён. — У некаторых еўрапейскіх сталіцах развіццё адносін з Беларуссю бачаць выключна праз прызму дэмакратызацыі, праз грамадскае жыццё ў краіне. Такая лінія як у гістарычным, так і ў бягучым плане з'яўляецца не самай перспектыўнай».

Самусенка адзначыў, што шэраг візавых абмежаванняў у дачыненні беларускіх чыноўнікаў «носіць выключна прапагандысцкі характар», а таксама, што патрабаванні ЕС па ацэнцы сітуацыі з дэмакратыяй Беларусі і правамі чалавека носяць «падвойныя, патройныя і яўна завышаныя стандарты».

Пасля выступу Вольгі Стужынскай, якая патлумачыла, чым займаецца яе Офіс у Брусэлі, пытанне ўзнікла ў Алены Ладуцкі з БТ (раней яна была асабістым карэспандэнтам Аляксандра Лукашэнкі). Перш чым яго задаць, яна ўдакладніла, грамадзянкай якой краіны з'яўляецца Стужынская, а таксама як часта бывае ў Беларусі — намякаючы, што ёй у Брусэлі не бачна сапраўднай сітуацыі ў краіне. Але Стужынская адказала, што з'яўляецца грамадзянкай Беларусі і бывае там практычна штомесяц. Тады Ладуцька задала галоўнае пытанне: «А якія ў вас асабіста прэтэнзіі да Беларусі? Што вас не задавальняе?» Гэтае пытанне наконт прэтэнзій да Беларусі рэфрэнам паўтаралася на працягу ўсёй паездкі з боку дзяржаўных журналістаў. Задавалі яны яго і еўрапейскім чыноўнікам. Здавалася, яны ніколі не чулі пра дванаццаць (цяпер ужо пяць) умоваў Еўрасаюза ў дачыненні Беларусі.

## Пяць крокаў у абдымкі Еўропы

Пра «пяць ўмоваў» прадстаўнікі ЕС казалі рэгулярна. У адказе амаль на кожнае пытанне гучала гэтае спалучэнне. Ключавой умовай, вядома, называлася правядзенне свабодных і празрыстых выбараў. Праўда, і тут знаходзіліся вострыя куты. Вядома, што Еўрасаюз не прызнаў рэферэндумы, праведзеныя Аляксандрам Лукашэнкам. У тым ліку і той, дзе ён атрымаў магчымасць балатавацца неабмежаваную колькасць разоў.

Адно з пытанняў, зададзеных беларускімі журналістамі, тычылася таго, як паставіцца ЕС да самога факту балатавання Лукашэнкі на пост кіраўніка дзяржавы на наступных выбарах. У адказ прагучала, што ЕС прызнае любы вынік выбараў, калі яны пройдуць справядліва. То бок стала зразумела, што ва ўмовах дыялогу папярэднія заявы наконт рэферэндумаў анулюваліся. Еўропа пагадзілася супрацоўнічаць з Лукашэнкам, нават калі ён выйграе выбары — але паводле дэмакратычных правілаў.

Наогул жа, ствараецца ўражанне, што ў Брусэлі добра ведаюць сітуацыю ў Беларусі і выдатна азнаёмленыя з кожнай праявай аўтарытарызму.

Напярэдадні з універсітэта выключылі прэс-сакратарку «Маладога фронту» Таццяну Шапуцьку. Гэтая тэма падымалася ў размовах неаднойчы. На рэмарку Алены Ладуцкі наконт таго, што нельга прапускаць заняткі, кіраўнік аддзела дэпартамента па замежных сувязях і палітыцы добрасуседства Джон О'Рурк задаў ёй сустрэчнае пытанне: ці не прапускала яна заняткі ва ўніверсітэце? Журналістка не знайшла што адказаць.

Маўчалі дзяржаўныя журналісты і пасля заявы аднаго з прадстаўнікоў камісіі па Беларусі. Яна тычылася актываў найвышэйшых беларускіх чыноўнікаў у Еўропе. Яны былі раней замарожаныя, але сёлетні факт прыпынення санкцый азначае, што зараз яны ў вольным доступе. Пытанне незалежных журналістаў было зададзенае ў лоб: «Кіраўнік Беларусі мае грашовыя актывы за мяжой?». Еўрачыноўнік Канстанцін Вардакіс адсёк: «Я не буду адказваць на гэтае пытанне».

## «Шчаслівы білет» на прэс-канферэнцыю з Мартынавым

Падчас нашага візіту ў Брусэль туды прыляцеў і міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. Пасля запланаванай сустрэчы мелася адбыцца прэс-канферэнцыя з удзелам еўракамісаркі Беніты Ферэра-Вальднэр, каардынатара замежнай палітыкі Еўрасаюза Карла Більта і іншых міністраў замежных спраў краін-удзельніц праграмы «Усходняга партнёрства». У Беларусі рэдка выпадае магчымасць трапіць на такое мерапрыемства, але акрэдытацыя ў Брусэлі не склала вялікай цяжкасці. Пытанне, адказ на якое нас цікавіў, было зноў жа датычнае выключэння Таццяны Шапуцькі і таго, наколькі яно паўплывае на ўдзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». Задавалася яно Більту, але і Мартынаў зрэагаваў на яго, адказаўшы, што «ўрады не выключаюць студэнтаў». У адказ на гэтую рэмарку Більт зноў жа выказаўся, што ва ўніверсітэт не мусілі звяртацца спецслужбы. Прэс-канферэнцыя скончылася, але пытанні да Мартынава яшчэ засталіся. Скарыстаўшыся магчымасцю, я падышла да яго ў калідоры і папрасіла на іх адказаць. На гэта па-беларуску ён сказаў, што «ў яго няма часу», і хутка рэціраваўся. Пасля ўкраінскі калега мне прызнаўся, што дагнаў Мартынава і той адказаў на ўсе ягоныя пытанні.

Вось такія «падвойныя стандарты».

# Алкаеў: Снягір спрабаваў маніпуляваць Лукашэнкам

**10 снежня ў Варшаве адбылася сустрэча з Алегам Алкаевым, аўтарам кнігі «Расстрэльная каманда».**



На сустрэчу прыйшло каля 150 чалавек. Пасля прэзентацыі Алкаеў адказаў на некалькі пытанняў.

**— Ці была ў Беларусі на Вас заведзеная крымінальная справа за паклёп і дыскрэдытацыю службовых асобаў, якіх Вы ўзгадваеце ў кнізе і абвінавачваеце ў забойстве беларускіх палітыкаў?**

**Алег Алкаеў:** Ніякай справы не было і быць не можа. Каб завесці крымінальную справу, трэба правесці экспертызу кнігі, а каб гэта зрабіць, трэба дапытаць Сівакова, Шэймана, Навумава, Паўлічэнку і нават самога Лукашэнку. А гэтага ніхто рабіць не будзе.

Дзіўны яшчэ той факт, што гэтай кнігі быццам бы няма. Яе ўсе баяцца, яе баіцца міліцыя. Не было выпадкаў, каб міліцыя афіцыйна канфіскоўвала маю кнігу. Каб яе канфіскаваць, трэба занесці яе ў пратакол, а потым, як я ўжо казаў, зрабіць экспертызу, калі кнігу прызнаюць небяспечнай.

**— Ці засталіся на Беларусі сведкі гэтай справы?**

**АА:** Вядома, засталіся. Гэта мае калегі, але я не магу называць іх імёны, бо ў іх ёсць родныя, дзеці. Носьбітам інфармацыі нялёгка жывецца ў Беларусі. Прыкладам таго ёсць Міхаіл Снягір, зняты з пасады і арыштаваны пасля антыкарупцыйнай нарады з удзелам Аляксандра Лукашэнкі. Ён быў носьбітам, але ягоная інфармацыя ўжо нічога не вартая. Ён асабіста прысутнічаў пры вызваленні Дзмітрыя Паўлічэнкі і ведаў, што яно незаконнае. Ён спрабаваў маніпуляваць Лукашэнкам, толькі нічога не выйшла. І цяпер, што б ён ні казаў, яму ніхто не паверыць, бо вельмі доўга ён выконваў загады і быў задаволены сітуацыяй.

**Гутарыў РШ**

# Станіслаў Шушкевіч:
# Беражыце сумленнасць

15 снежня Станіславу Шушкевічу, першаму кіраўніку незалежнай Рэспублікі Беларусь, споўнілася 75 гадоў.

Калі я даведаўся, што Станіславу Шушкевічу хутка будзе 75, паверыў не адразу. Бо літаральна за некалькі дзён да гэтага бачыў яго, энергічнага і гаваркога, на прыёме ў пасла Францыі. Той самы недавер не пакідаў мяне і падчас больш чым дзвюхгадзіннай гутаркі з нагоды юбілею. Станіслаў Станіслававіч некалькі разоў перарываў размову, адказваючы на званкі свайго суперсучаснага айфона, паказваў на маніторы камп'ютара фотаздымкі, вадзіў нас па сваёй кватэры, застаўленай падарункамі прэзідэнтаў і кіраўнікоў урадаў, хваліўся картай пастаяннага кліента вядомай авіякампаніі (якую даюць пасля налёту 100 тысяч міль, дарэчы) і пры гэтым яшчэ паспяваў распытваць пра нашае жыццё. Словам, ягонай энергіі могуць пазайздросціць нават 25-гадовыя.

Аб чым можна запытацца ў чалавека, які старэйшы за цябе на паўстагоддзя? Аб чым заўгодна. Адказы будуць. Распавядае Станіслаў Шушкевіч.

### Сябе я памятаю з 1936-га

Мая маці сваё здароўе паклала, каб нас выгадаваць. Яна закончыла педінстытут, спачатку працавала ў Койданаве — была кіраўніком мясцовай самадзейнасці. Была членам Саюза пісьменнікаў СССР — на білеце членскім подпіс Горкага стаіць. Друкавалася пераважна на польскай мове. Тады ж існавала спецыяльная секцыя польскамоўная, каб разлажыць польскіх пісьменнікаў...

Маці ў 1980-м годзе памерла. Заўсёды вучыла мяне ўспрымаць рэчаіснасць спакойна. Гэта яна мяне пераканала стаць фізікам. Маці ўвесь час гаварыла пра «сапраўдную адукацыю» — лекараў, біёлагаў, фізікаў. Мая настаўніца расійскай мовы потым наракала на мяне. Маўляў, выбраў фізіку, а не лірыку.

Сябе я памятаю з 1936-га. Тады якраз памёр мой дзед, а ў дзіцячай памяці адклаліся ягоныя боты. У садзе мы ставілі самавар, і яго гарачая труба адной-чы прыпаліла мне нагу, а дзед мяне суцяшаў. Вось з таго моманту мне боты дзедавы і запомніліся.

Недзе напрыканцы 1939-га я навучыўся чытаць, і маці пачала даваць мне бацькавы лісты. Можна было раз у месяц дасылаць лісты. Я добра памятаю, як адказваў яму на беларускай мове. Шкада, што нічога не захавалася. А потым пачалася вайна, і яна вельмі выразна адклалася ў памяці. Першы дзень асабліва — бабуля мяне якраз у цырк павяла. Ніхто ж не думаў, што вайна так доўга будзе. Потым маці мяне ў вёску адвезла. Зіму я ў вёсцы ў дзеда правёў, падчас акупацыі быў тут. Толькі пасля вайны пайшоў у школу — адразу ў 4-ы клас, бо ўмеў чытаць і пісаць.

Першай маёй дзейнасцю грамадскай была праца ў рэдакцыі — дзеткорам — дзіцячым карэспандэнтам. Тэксты мае падпраўлялі, і таму ў школе набыў мянушку «дзетбрэх». Праз рэдакцыю я трапіў аднойчы ў Артэк — такі вялікі ўспамін дзяцінства. Туды з Беларусі паехала вялікая група дзетдомаўцаў — мы, чатыры недзетдомаўцы, толькі трапілі туды. Запомнілася, што ў Артэку ежы было колькі хочаш. Я нават хлеб збіраўся па кішэнях хаваць...

У Артэку пачаў вучыцца як след. Туды паехаў двоечнікам, а вярнуўся выдатнікам. Потым у школе медаль атрымаў.

### І я думаў, што тыя дактары — здраднікі

Я памятаю, як адліга пачалася. Складаны гэта быў час.

На адно з пасяджэнняў студэнцкіх прыходзіць чалавек і кажа: «Берыя — здраднік». А мой сябар, Віктар, у штыкі гэта прыняў. Накінуўся на яго. У нас не было іншых думак. І я ж думаў, што тыя дактары — здраднікі... Мае аднакурсніцы плакалі, калі Сталін памёр. Цяпер гэта ўспамінаюць. Вельмі прыстойныя дзяўчаты, жанчыны. Сціплыя людзі былі. Нягледзячы на тое, што шмат хто належаў да партнаменклатуры. У маёй сям'і, вядома, усе ведалі пра злачынствы партыі. Але ціха аб гэтым гаварылі.

У канцы 1950-х людзі баяліся вельмі. Дысідэнтам ніколі не быў. У 1974-м я ў Кракаў прыехаў і трапіў выпадкова на выступ Караля Вайтылы. Ён тады яшчэ не быў Папам, але такую праўду гаварыў публічна... Я падумаў, чаму ж яго ў турму не пасадзяць — у нас бы за такое даўно пасадзілі. Пяць казаняў я праслухаў. Унутрана абураўся гэтай антысаветчынай.

Усё ў нас глыбока было. Мой бацька, нават 20 гадоў у турме адседзеўшы, толькі за год да смерці ў камуністах расчараваўся. Я доўга беспартыйным быў, але калі стаў прарэктарам па навуковай працы, то прыйшлося ў партыю ўступіць. Усе пытанні тады вырашаліся на партыйных сходах.

Я быў савецкім чалавекам, і з цяжкасцю гэта выціскаю з сябе па сённяшні дзень. Часам лаўлю сябе на думцы, што хачу дзейнічаць па-бальшавіцку.

### Для мяне галоўным было, што Расія прызнае незалежнасць

Я быў фізікам. Не ведаў нават, што ўтварыўся БНФ. Займаўся навукай — пад маім кіраўніцтвам было абаронена 33 дысертацыі. Нават у прарэктары я трапіў супраць сваёй волі. Неяк не хацелася адыходзіць ад навуковай дзейнасці.




**Станіслаў Шушкевіч**

нарадзіўся 15 снежня 1934 у Мінску. Навуковец і палітык, дэпутат Вярхоўнага савету 12-га і 13-га скліканняў, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук, першы кіраўнік незалежнай Беларусі, адзін з трох удзельнікаў падпісання ў снежні 1991 г. Белавежскіх пагадненняў аб юрыдычным замацаванні распаду СССР. Ад 1998 лідэр партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада.

А ў палітыку... Я ў палітыку выпадкова трапіў. Увесь час быў заняты на сваёй кафедры. Там працавала дзвесце чалавек — кіраваць імі і займацца яшчэ нечым было немагчыма. Але мае сябры ўніверсітэцкія ўчынілі жарт. Мы неяк правялі добры вечар і не на сухую, як кажуць. Вось там яны мяне падлавілі: сказалі, што заўтра вылучаць кандыдатам у народныя дэпутаты СССР, і ўзялі слова, што я не здыму сваю кандыдатуру. З гэтага ўсё пачалося.

Акурат Чарнобыль быў. Гэтая трагедыя моцна на нас усіх паўплывала. Памятаю, як мы выпадкова пра Чарнобыль даведаліся. Студэнтка-практыкантка праводзіла вымярэнні і выявіла павышаны фон. Выкладчыца тую студэнтку некалькі разоў адпраўляла ўсё перапраўляраць, пакуль зразумела, у чым справа.

Тады і праявіўся ўвесь гэты савецізм. Самы непрыглядны яго бок. Рэакцыя чыноўнікаў была чыстым злачынствам. Нельга было маўчаць, а яны маўчалі. Рабілі выгляд, што ўсё добра. Шмат хто зразумеў тады, што савецкая сістэма падштурхоўвала на злачынствы людзей.

У 1991 годзе самым важным было абранне Гарбачова прэзідэнтам СССР. Да Гарбачова па-рознаму мы ставіліся. Спачатку нават партрэт яго ў мяне visеў, але пасля Чарнобыля стаўленне рэзка пагоршылася. А калі ГКЧП адбылося, то ўсё было вырашана. Мяне старшынёй Вярхоўнага Савета лёгка даволі абралі. З БНФ нікога не хацелі выбіраць, а я як быццам быў нейтральны.

У канцы кастрычніка нас у Агарове Гарбачоў сабраў і прапанаваў праект новай саюзнай дамовы. Толькі мы з Ельцыным раскрытыкавалі яе. Там шмат недакладнасцяў было тэрміналагічных. У Агарове з Ельцыным і дамовіліся аб сустрэчы ў Белавежскай пушчы, на паляванні.

Калі падпісалі Белавежскія пагадненні, спачатку ніякага адчування не было асаблівага. Тады я ўжо быў крыху дасведчаным чалавекам у гістарычным плане. Для мяне галоўным было тое, што Расія прызнае незалежнасць Беларусі. Для Ельцына зусім іншае важна было. Таму ён у 1997 годзе публічна пашкадаваў аб тых пагадненнях. А я задумаўся аб падзеі толькі па дарозе назад. Было неабходна адразу паставіць дакументы на разгляд Вярхоўнага Савета. Я добра разумеў, што калі белавежскія пагадненні не ратыфікуюць — гэта будзе канцом маёй кар'еры. Адзін выраз «СССР перастае існаваць» чаго варты быў.

Быў вельмі здзіўлены, калі толькі адзін голас супраць падалі. Думаю, што гэта Ціхіня так прагаласаваў, таму што ён і выступіў супраць.

### Калі маладое пакаленне зойме кіруючыя пасады — усё зменіцца

20 гадоў прайшло. Людзі зараз іншыя. А тыя, якім сёння 20—25 гадоў, увогуле не жылі пры Савецкім Саюзе. Яны нарадзіліся ў незалежнай краіне. Адчуванне таго, што ты грамадзянін Беларусі — гэта вельмі добра.

У старэйшага пакалення інакш. Большасць, наадварот, з настальгіяй узгадвае СССР. Яны памятаюць усё, што было добрае. А наша прапаганда карыстаецца гэтым.

Думаю, калі маладое пакаленне зойме кіруючыя пасады — усё ў нас зменіцца. Змяніць сёння старое пакаленне немагчыма. Ва ўладзе ёсць сумленныя і адукаваныя людзі, але ім зручней працаваць моўчкі на гэтую структуру, на рэжым. Калі б змены адбыліся, то яны таксама добра працавалі б. Але самі яны нічога мяняць не будуць у большасці сваёй.

Бяда і з апазіцыяй. У нас тасуецца адна і тая ж калода. Размовы пра раз'яднанасць — глупства. Калода аб'яднаная. Аднак у апазіцыянераў ёсць толькі жаданне сябе паказаць. Яны перакананыя, што ведаюць, што такое палітыка. Аднак не маюць належнай адукацыі, не чыталі належных кніжак. Апазіцыя добра пратэстуе супраць існага парадку, але не больш. Прафесійнага разумення палітыкі ў большасці апазіцыянераў няма.

Праблема і з культурай нацыянальнай. Слоўнікаў беларускіх нават спецыялізаваных няма. Лавіна новых ведаў патрабуе гэтага. А ў нас дзяржава не падтрымлівае мову, не стварае новых моўных інстытутаў. Гэта фактычна знарок робіцца. У Ісландыі на гэта хапае сродкаў, а ў нас — не. Наша ўлада добра разумее, што робіць. Не трэба лічыць, што гэта проста нейкі недагляд.

### Адно хачу параіць

Я ўжо немалады. І сёння даводзіцца шмат працаваць па ўсім свеце. Мяне нават пенсіі пазбавілі, як усе ведаюць.

Парады я не люблю даваць. Толькі адно хачу параіць. Гэта раіў і буду раіць. Беражыце сумленнасць. Беларусы — сумленная нацыя. І ў нас многа добрых прыкладаў.

Нам трэба шукаць Беларусь сучасную. Не ўспрымаць тое, што на паверхні ляжыць. Маладым трэба імкнуцца вучыцца. Навучыцца гэтаму.

**Запісаў Алесь Пілецкі**

# Каб людзі менш пілі, трэба, каб яны больш зараблялі

Пісьменнік і ўласнік гарэлачнага завода. Як гэта спалучаецца ў адным чалавеку? З Леанідам Дайнэкам гутарыць **Наталка Бабіна**.

Леанід Дайнэка — празаік і паэт, аўтар дзевяці раманаў. Ягоныя творы ўваходзяць у школьную праграму. Ён багаты бацька — мае трох сыноў, і багаты дзядуля — ганарыцца пяцю ўнукамі. А яшчэ ён — паспяховы бізнэсовец, уладальнік прадпрыемства «Белпі», якое размешчана ў вёсцы Жажэлка пад Жодзінам і выпускае алкагольныя напоі — у тым ліку «Крамбамбулю».

Размова з такім рознабаковым чалавекам, натуральна, тычылася і сям'і, і творчасці, і вытворчасці. Да размовы далучылася і яшчэ адна цікавая асоба — персанальны цэнзар, рэдактар, кухар, кіроўца і муза спадара Дайнэкі — ягоная жонка Зінаіда.

**Наталка Бабіна: Спадар Дайнэка, адкуль Вы, хто Вашыя бацькі? Раскажыце пра жонку, сыноў, унукаў. Вы шчаслівы ў сям'і?**

**ЛД:** У маім прозвішчы балцкі корань: «дайна», песня. Нездарма ёсць некалькі вядомых спевакоў з такім прозвішчам. А ёсць яшчэ меркаванне, што дайнэкамі ў XVII стагоддзі называлі людзей, якія баранілі ад нападнікаў — маскоўскіх войскаў, казакоў Хмяльніцкага — землі Вялікага Княства. Наша сям'я з Цэнтральнай Беларусі, з Клічаўшчыны.

Імя бацькі — Марцін — для мяне яшчэ адно

> Мне адна казала: не хачу рабіць на пана! Я ёй адказаў: які я табе пан? Ты п'яная з раніцы, а я на канвееры стаю. Такое панства.

напамінанне пра еўрапейскасць. Як і імя маці — Тэкля. Продкі былі свабодныя людзі, не прыгонныя. Аднадворцы, магчыма, шляхта. Ёсць у нас Данэйкі — шляхецкі род, і, я думаю, наша прозвішча — тое ж, толькі наўмысна перакручанае нейкім царскім пісарам. Бо продкі мае былі свабодалюбівыя — мяркую па характары дзеда Сцяпана — і змагаліся за вольнасць нашых зямель.

Беларуская мова для мяне натуральная з дзяцінства, я скончыў беларускую школу, адно толькі ваенная справа была па-расійску. Мая мама ведала на памяць безліч вершаў. Як для любога сына, маці для мяне — святая. З такой самай любоўю і пашанай стаўлюся да адзінай і каханай жонкі Зінаіды, якая нарадзіла мне трох сыноў. Я сваёй сям'ёй шчаслівы. Я бачу, што мае сямейнікі мяне паважаюць і слухаюцца, і я таксама прыслухоўваюся да іх.

### Маскультура замяніла літаратуру

**НБ: Што з напісанага Вамі лічыце найбольш важным?**

**ЛД:** Нельга вылучыць са сваіх твораў больш ці менш удалыя — як нельга вылучыць больш ці менш удалага з сыноў. Ніколі не пісаў на замову. Я — індывідуаліст. Таму і стаў пісьменнікам, што гэта прафесія для індывідуаліста. Зараз пішу дзесяты па ліку раман. Ён, відаць, будзе называцца «Той, каго ўдарылі па шчацэ» і прысвечаны будзе беларускаму пакутніку, біскупу Язафату Кунцэвічу, якога забілі ў Віцебску ў 1623 годзе.

Увогуле, ганаруся, што я беларускі пісьменнік. Беларуская літаратура мае сваю таямніцу. Яшчэ пры канцы XIX стагоддзя яна была забароненая, яе практычна не было. І раптам у 1920-я яна, як паводка, дае цэлую плойму пісьменнікаў і паэтаў — яркіх, таленавітых. Феномен!

**НБ: Вашыя кніжкі выдаваліся накладамі ў сорак тысяч. Зараз наклад беларускай кніжкі — добра, калі адна-дзве тысячы. Чаму змізарнелі наклады?**

> Вяскоўцы, якіх мы спачатку набіралі на працу, фізічна не могуць восем гадзін працаваць. Яны адвыклі ад працы. І цяпер мы прывозім працаўнікоў з Жодзіна. І заўважна, што моладзь працуе значна лепш.

**ЛД:** Прычына ў тым, што знікла беларускамоўная школа. А яшчэ ў тым, што ўсё зараз забівае тэлебачанне, эстрада, паўголыя спявачкі. Раней вылузваліся са скуры, каб паказаць адзенне, а зараз вылузваюцца з адзення, каб паказаць скуру. Спевакі, акцёры занялі месца пісьменнікаў. А хто такія акцёры? У Сярэднявеччы акцёраў не лічылі свабоднымі людзьмі, іх выганялі з гарадоў. А пісьменнік заўсёды быў настаўнікам і нават месіяй...

І з часам літаратура яшчэ зойме годнае становішча. Яна будзе жыць. Нягледзячы на мікраскапічныя наклады, безграшоўе, кпіны. Яна — сапраўды дух народа.

**НБ: Хто з сучасных пісьменнікаў для вас найцікавейшы?**

**ЛД:** Вось раскалоўся наш саюз пісьменнікаў. Я застаюся ў старым — у якім былі Купала, Колас, Танк, Шамякін. Не бачу сэнсу бегчы на новы літаратурны карабель — куды я пабягу ад сябе? Зараз у нашай літаратуры мне найбольш цікавыя два Уладзіміры — Някляеў і Арлоў. Сур'ёзныя пісьменнікі. Княгіня нашай літаратуры — Вольга Іпатава. Як не згадаць і Леру Сом, Леаніда Дранько-Майсюка, Васіля Зуёнка...

### Рабіць гарэлку — не грэх

**НБ: Калі і чаму Вы вырашылі заняцца гарэлачным бізнэсам?**

**ЛД:** На пачатку 1990-х, калі памёр Савецкі Саюз, я вырашыў пайсці на вольны хлеб. Была тады магчымасць ствараць малыя прадпрыемствы, і 5 снежня 1990 года я зарэгістраваў сваё.

Я хацеў ні ад каго не залежаць і сам сябе забяспечваць. Бо літаратура ж не корміць! Я быў

> Раней вылузваліся са скуры, каб паказаць адзенне, а зараз вылузваюцца з адзення, каб паказаць скуру.

пэўны, што ствараць трэба вытворчасць, а не бізнэс тыпу «купі-прадай».

**НБ: А не грэх — рабіць гарэлку?**

**ЛД:** Мяне часам папракаюць: ты спойваеш народ, алкаголь — смерць народу. Дык я скажу: ніякая гэта не смерць! Алкаголь быў і будзе з людзьмі заўсёды. Спіртавыя клеткі даюць энергію, і нават жыццё ў протаакіяне пачыналася са спіртавых клетак. І на генным узроўні мы пра гэта памятаем. Алкаголь стаіць на стале і на вяселлі, і на хаўтурах. Жыць без алкаголю нецікава. Апошнія словы вялікага Чэхава былі: «Шампанскага!»

Каго я спойваю? Нашы гарэлкі разлічаны на сярэдні клас, на чалавека, які мае грошы і хоча набываць якасны напой.

**НБ: Вы б ухвалілі сухі закон у Беларусі?**

**ЛД:** Адназначна, не. Гэта не спрацоўвала ніколі. Сухі закон — гэта мафіязацыя грамадства, росквіт крымiналу. Каб людзі не злоўжывалі алкаголем, трэба, каб яны больш заараблялі. Каб не куплялі барматуху розную, а набывалі якасныя напоі. Каб чалавек быў упэўнены, радасны, спакойны. Калі ён паўгалодны, калі ў яго процьма праблем, лягчэй за ўсё напіцца. Да таго ж, у нас зусім няма кавярняў, шынкоў, дзе б людзі маглі спакойна пасядзець за куфлем піва, за кавай ці й за чарачкай...

### Улады зразумелі, што бізнэс патрэбны

**НБ: Складана было пачынаць справу?**

**ЛД:** Прыходзілася і на канвееры стаяць начамі. Бо сутыкнуліся з тым, што вяскоўцы, якіх мы спачатку набіралі на працу, фізічна не могуць восем гадзін працаваць. Яны адвыклі ад працы. І цяпер мы прывозім працаўнікоў з Жодзіна. І заўважна, што моладзь працуе значна лепш.

Мне адна казала: не хачу рабіць на пана! Я ёй адказаў: які я табе пан? Ты п'яная з раніцы, а я на канвееры стаю. Такое панства.

**Зінаіда Дайнэка:** Калі пачыналі прадпрыемства, мне было 54 гады. І кожны дзень мы ездзілі з Мінска ў Жажэлку, я была за рулём. Прыязджаем з раніцы — цёмна і ціха, уся вёска спіць. Вечарам з'язджаем — усе зноў спяць, а нам яшчэ гадзіну да Мінска ехаць... Таму крыўдна слухаць размовы пра тое, што бізнэсоўцы не працуюць, а толькі дывідэнды атрымліваюць.

> Бізнэс немагчыма весці наскокам.

**НБ: Ці цяжка канкураваць у гэтай сферы?**

**ЛД:** Ракфелер казаў: «Бізнэс — нешта сярэдняе паміж спортам і вайной». Ты рызыкуеш маёмасцю, адказваеш і за поспехі, і за няўдачы. Побач працуюць канкурэнты — у нашым выпадку гэта вялізны «Крышталь» са стогадовай гісторыяй, абласныя заводы. Напачатку нам казалі: ды вы не вытрываеце два месяцы! А мы вырашылі, што зоймем нішу, якую не дадумаўся заняць ніхто: будзем выпускаць беларускі нацыянальны брэнд — «Крамбамбулю».

Цяпер на нашым прадпрыемстве працуе 60 чалавек. Пастаўляем прадукцыю прыкладна ў тысячу крамаў. Плацім падаткі, і немалыя. Плацім заробкі, прычым па ведамасці. Увогуле, не прымаем махінацый. Аднойчы да мяне прыйшоў адзін маладзён, кажа: «Дайце мне на тыдзень завод, і я абагачуся!» А я сказаў: «Хлопча, ты ўжо на наступны дзень будзеш сядзець на нарах!» Бізнэс немагчыма весці наскокам. Толькі карпатлівым будаўніцтвам. Сёння я ўжо на пенсіі, а на заводзе працуюць мае сыны Сяргей, Зміцер, Сцяпан.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Леанід Дайнэка**
нар. у 1939. Пісьменнік. Аўтар дзевяці раманаў, у тым ліку культавых «Меч князя Вячкі» і «След Ваўкалака». Ягоныя творы ўваходзяць у школьную праграму. Уладальнік прадпрыемства «Белпі», якое размешчана ў вёсцы Жажэлка пад Жодзінам і выпускае алкагольныя напоі — у тым ліку «Крамбамбулю». Бацька трох сыноў.

**НБ: Як Вы ацэніце, ці спрыяльны ў Беларусі клімат для прыватнага бізнэсу?**

**ЛД:** Апошнім часам бізнэсам стала займацца лягчэй. Менш праверак, гуманней дзейнічае падатковая інспекцыя. Улады зразумелі, што бізнэс — гэта патрэбна. Раней на заводзе праверкі не пераводзіліся. Не заўсёды паводзілі сябе карэктна. Бывалі выпадкі, калі да мяне, дырэктара, у кабінет урываліся нейкія людзі і першае, што гаварылі: «Маўчаць! Сядзець!» Цяпер такога няма.

### Спірытус — значыць «дух»

**НБ: Вы падтрымліваеце шматлікія культурныя мерапрыемствы? Чаму?**

**ЛД:** Спірытус — гэта на лаціне «дух». Але мы ж павінны падтрымліваць і дух культуры! Мы дапамагалі музыкам, спевакам — Піту Паўлаву, Славу Кораню, Лявону Вольскаму, гурту «Стары Ольса», N.R.M... Дапамаглі літаратарам: выдалі кнігу «Голас» добрага паэта Васіля Гадулькі, які, на жаль, рана памёр, выдалі калектыўны зборнік маладых паэтаў «Літаратурны праспект»...

На жаль, зараз, ва ўмовах крызісу, не заўсёды можам выдаткаваць грошы на такую дзейнасць. Але будзем спадзявацца, хутка надыдуць лепшыя часы.

**НБ: А яны надыдуць?**

Калі нарадзіўся на свет чалавек — трэба і жыць. Не баяцца жыцця. Як сказаў Папа Ян Павал II: «Не бойцеся!»

# Купалаўскі парк патрабуе новых скульптур

Скульптар Генік Лойка падрыхтаваў іх праект.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ягоныя кампазіцыі ўвасабляюць чатыры творы беларускага песняра — «Прарок», «На куццю», «Песня званара», «У купальскую ноч».

Сваю працу сп.Лойка збіраўся падаць на конкурс новых скульптур для сквера Янкі Купалы, што мусілі паўстаць побач з помнікам песняру пасля рэканструкцыі. Конкурс, праўда, адмянілі. Але Генік Лойка не збіраецца адступаць. Са сваім праектам ён збіраецца звярнуцца да кіраўніцтва горада.

«Купалаўскі сквер патрабуе скульптур, прысвечаных менавіта творчасці паэта. Магчыма, кожнае пакаленне будзе прапаноўваць сваё прачытанне ягонай спадчыны, будзе дапаўняць беларускую прастору новымі скульптурамі. Мы ж сёння прэзентуем свой водгук на яго творчасць», — кажа сп.Лойка.

Кожная кампазіцыя мае дзве назвы — «Тры ганцы/Князь і княжна», «Груганнё/Прарок», «Разбіты звон/Купальская ноч».

З паэмы «На куццю» скульптар вырашыў адлюстраваць момант знікнення князя і княжны. Але як паказаць гэты сюжэт, калі ў руках толькі цвёрдыя матэрыялы — бронза ды камень? На выставе «Міленіум Літвы» ў Палацы мастацтва быў прадстаўлены эскіз гэтай кампазіцыі. Ён уяўляе сабой постаці трох ганцоў на кургане. А пад імі подпіс: «Князь і княжна». Глядач быў вольны палічыць гэта за памылку або сапраўды ўгледзець князя з княжной — іх фігуры ўгадваюцца ў пустотах між постацямі ганцоў. Аўтар проста ўцягвае гледача ў сваю гульню: «Глядзіце — і знойдзеце».

Іншыя дзве кампазіцыі — «Груганнё/Прарок» і «Разбіты звон/Купальская ноч» — таксама маюць таямніцы, таксама заклікаюць да суаўтарства. Але з гэтымі эскізамі яшчэ ідзе праца, і скульптар не хоча раскрываць усе сакрэты.

**Кастусь Матушыч, фота Юліі Дарашкевіч**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Стары Ольса




Лепшае, West Records, 2009

**ПахісНуць упэўненасць, што старадаўняя беларуская музыка — гэта «Харошкі».**

Лідэры «сяряднявечнай» музыкі вырашылі сабраць свае галоўныя творы з нагоды 10-годдзя гурта. Ваенная патрыётыка, старажытныя танцы, песні-услаўленні ды проста задушэўныя спевы пра «Карчму» і «Ружу» — усё, што можа аднавіць у памяці сярод ночы прыхільнік «ольсаў». Пэўна дыск разлічаны на тых, у каго да падобнага музычнага прадукту раней рукі не даходзілі: «Лепшае» здольнае кампенсаваць белыя плямы ў музычнай і гістарычнай адукацыі ды пахіснуць упэўненасць, што старадаўняя беларуская музыка — гэта «Харошкі» з «Бяседаю». Дыск дапаўняюць тры заліковыя бонусы: вядомыя творы «ольсаў» трохі асвяжыў ды-джэй. Во каб з ім гурт цэлы новы альбом запісаў!

## Рэпер Сярога: Вобраз беларуса «чарка, скварка і мая хата з краю» — не для мяне



Паводле яго словаў, вобраз беларуса зараз мяняецца.

«Я бачу іншых беларусаў — больш адкрытых, больш інфармаваных, менш закрытых і заціснутых. І мне гэты вобраз падабаецца», — сказаў на прэс-канферэнцыі ў Мінску гомельскі рэп-музыка Сярога (Сяргей Пархоменка).

Адказваючы на пытанне пра яго песню на беларускай мове «Лялька», Сярога прызнаўся, што тэкст напісаў не ён, а быў перакладзены ягоным сябрам для выдання зборніка.

Ён пацвердзіў інфармацыю пра намер завяршыць кар'еру. У той жа час ён плануе арганізаваць у Мінску канцэрт украінскай спявачкі Ры (Маргарыта Смялянская-Галіцкая), прадзюсаваннем якой займаецца.

Адказваючы на пытанне з нагоды ўдзелу ў рэкламным ролiку 3G life:), выканаўца сказаў: «Вы ўсе выдатна разумееце, чаму я там зняўся, — мне за гэта заплацілі. Ролік атрымаўся вельмі пазітыўны, народны, бадзёры. Спадзяюся, што паслуга якасная». Па ягоных словах, раней яму даводзілася здымацца ў рэкламе сухарыкаў.

«Але сухарыкаў я не ем і 3G life:) у мяне няма», — дадаў Сярога.

**БелаПАН**

## У «Беларускім кнігазборы» — 50-я кніга! Гарэцкі

У Залатой серыі «Беларускі кнігазбор» рыхтуецца да выхаду 50-ы том. Кнігу складуць выбраныя творы Максіма Гарэцкага: аповесці «Дзве душы», «Ціхая плынь», «На імперыялістычнай вайне», п'еса «Жартаўлівы Пісарэвіч», апавяданні, публіцыстыка. Уклалі кнігу Тэрэза Голуб і Радзім Гарэцкі.

Да канца года ў серыі «Беларускі кнігазбор» з'явіцца яшчэ кніга Рыгора Кабца, а на пачатку наступнага — Уладзіміра Някляева.

**Кастусь Матушыч**

# Шалкевіч прывёз новага «таварыша Сапегу»



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Вечарам 11 снежня ў ДК Ветэранаў было шматлюдна. Канцэртная зала запоўнілася цалкам. І не толькі моладдзю, як тое бывае падчас выступаў рок-гуртоў. Адчувалася, што гродзенскі бард Віктар Шалкевіч мае свайго сталага слухача сярод прадстаўнікоў розных пакаленняў — ад малога да старога.

І чаканні гэтай разнастайнай публікі цалкам апраўдаліся. Шалкевіч спяваў пра Валожын і Магілёў, пра няўдалае каханне да жанчыны-алкагалічкі і пра палітэмігранта ў Швецыі, які не хоча вяртацца дадому.

Асабліва бурную рэакцыю ў слухачоў выклікала новая песня пра цыганоў і «Славянскі базар», якая мае ўсе шансы паўтарыць шалёны поспех «Таварыша Сапегі».

Скончаўся амаль дзвюхгадзінны выступ «Кароткай гісторыяй Беларусі». Публіка развітвалася са спеваком стоячы. А ён абяцаў прыехаць ізноў. У сакавіку 2010 года Віктар Шалкевіч прэзентуе новы альбом.

**Алесь Пілецкі**

### ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ

БАЛАДА ПРА СЛАВЯНСКІ БАЗАР.
МАНАЛОГ ЧАЛАВЕКА,
ЯКОМУ ЎСЁ ЎДАЛОСЯ

Эта была ў раёне вясной,
Гдзе гудзят і гудзят дзізеля.
Раз цыганка ка мне падбяжала,
Гаварыт: Дай, красівый, рубля.
А за эта, цібе, кучаравый,
Нагадаю дальнейшую жызьнь.
Стой спакойна, внімацельна слушай
І за сердцэ пакрэпчэ дзержысь…

Хоць гадалка я, но дзеўка чэсная,
Не салгу крывізны на устах.
І цыганка такое панесла мне,
Я ледзь–ледзь устаяў на нагах.

Што міня ждзёт кварціра ў Мінску,
Дзеньгі, власць і т.д. і т.п.
І знаком буду я з Папам Рымскім,
І пакажут міня па БТ…

Паднялась верцікальная планка
Сумашэдшых рэшаюшчых дней.
То, пра што нашаптала цыганка,
Саваршылась ў судзьбе у мяне.
Я дабіўся ўсіх благ і развіцья.
Людзям нашым я маць і ацец.
Разбіраюсь ў науке, паліціке,
Швец і жнец, і на дудке ігрэц…

Но асобае месца ў гаданіі,
Между жэншчын, віна і гітар,
Занімал красатой мнагаграннай
Знамені́тый «Славянскій базар».
Я здароўе і сілы угрохал
Чтоб на сцэну базара папасць,
І мячта мая квёлая, крохкая,
Хоць с трудом,
Но как–будто сбылась.

В таржэствуюшчэм жызні фінале
Под рычаніе медных фанфар,
Весь я вышал на сцэну Базара,
І заплакал «Славянскій базар».

### Калядны падарунак ад Свабоды

Вольная студыя

Новая кніга **Міхася Скоблы** — 50 гутарак з выбітнымі асобамі Беларусі.

Запрашаем на сустрэчу з аўтарам і героямі.

18:00. 18 сьнежня, пятніца, Палац мастацтваў. Вул. Казлова, 3.




# Частка V. Вандроўка радзімічаў

Раздзелы з новай кнігі гісторыка **Алега Дзярновіча**. Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39.



**Старажытнае гарадзішча. Малюнак Язэпа Драздовіча.**

### «Ляшская легенда»

Сёння, як і 900 гадоў таму, любы аповед пра радзімічаў у падручніках пачынаецца са згадак пра вандроўку гэтага племені, што пасялілася на самым паўднёвым усходзе Беларусі ў басейне Сажа. І сёння большасць гісторыкаў ідзе шляхам, які паказаў у пачатку XII ст. кіеўскі манах Нестар.

Летапісная традыцыя ўказвае на тое, што радзімічы былі навапасяленцамі на Сажы: «Радзімічы і вяцічы ж — ад роду ляхаў. Было ж два браты ў ляхаў — Радзім, а другі — Вятка; і прыйшлі і селі: Радзім на Сажы, і ад яго назваліся радзімічы». У «Аповесці мінулых гадоў» паданне пра прыход радзімічаў паўтараецца і яшчэ раз — пад 984 г.

Што цікава, легендарныя паведамленні пра прыход радзімічаў добра карэлююцца з археалагічнымі матэрыяламі. Славянскія археалагічныя помнікі, старажытнейшыя за IX ст., на тэрыторыі рассялення радзімічаў не выяўленыя.

Паведамленне летапісца пра прыход радзімічаў стала грунтам, на якім узніклі ўяўленні гістарыёграфаў, што панавалі некалькі стагоддзяў. Паводле іх, радзімічы былі адным з ляшскіх плямёнаў, якое пасялілася ў Верхнім Падняпроўі. Гэтае паданне імпанавала як польскім аўтарам XV—XVI стст. — Яну Длугашу і Мацею Стрыйкоўскаму, — так і гісторыкам і славістам XVIII—XIX стст. — чэху Паўлу Шафарыку, ліцвіну Тэадору Нарбуту, расіянам Васілю Тацішчаву, Мікалаю Карамзіну, Сяргею Салаўёву.

Прарадзіму радзімічаў змяшчалі ў розных кутках польскай тэрыторыі, у тым ліку ў басейне верхняй Віслы ля горада Радам. Але тапонімаў з асновай *рад-* на заходнеславянскай тэрыторыі вельмі багата.

Расійскім аўтарам ужо ў канцы XIX ст., калі этнаграфічная і моўная спецыфіка беларусаў актыўна фіксавалася, «ляцкае» паходжанне радзімічаў дазваляла вытлумачваць беларускае дзеканне і цеканне. Прынамсі, лінгвіст Аляксей Шахматаў і ягоныя сучаснікі бачылі тут польскія рысы.

Але напачатку XX ст. Яўхім Карскі давёў, што тое ж дзеканне развілося ў беларускай мове незалежна ад польскага, а на мясцовым этнакультурным грунце. Карскі пісаў, што паведамленні летапісца трэба разумець у пераносным значэнні. У тым сэнсе, што радзімічы прыйшлі ў Падняпроўе з заходніх рэгіёнаў, дзе жылі па суседству з ляхамі.

Няма заходнеславянскіх рысаў і ў матэрыяльнай культуры радзімічаў. Заходнеславянскія ўплывы на працягу VIII—XIII стст. сапраўды ахоплівалі амаль ўсе беларускія землі. Але ж арэал радзімічаў саступае ў гэтым сэнсе міжрэччу Дняпра і Нёмана, басейну Буга і Панямоння.

### Радзіміцкія ўпрыгожанні

У любым школьным ці ўніверсітэцкім дапаможніку пры апісанні радзімічаў абавязкова згадваюцца ўпрыгожанні, якія лічацца неад'емнай рысай гэтага племені — скроневыя сяміпрамянёвыя кольцы. Па месцах, дзе гэтыя кольцы знаходзілі археолагі, можна акрэсліць арэал рассялення радзімічаў у XI—XII стст. Асаблівая канцэнтрацыя гэтых знаходак на Пасожжы.

Сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы з'явіліся і пашырыліся сярод радзімічаў у X—XI стст. Але, паводле свайго паходжання, яны звязаныя з больш раннімі ўзорамі VIII—IX стст., якія сустракаюцца незалежна ад племянных межаў на даволі вялікай тэрыторыі. А гэтыя вырабы, у сваю чаргу, узыходзяць да ўпрыгожанняў араба-іранскага паходжання. Яшчэ ў канцы XIX ст. расійскі археолаг Сізоў давёў, што скроневыя сяміпрамянёвыя кольцы па сваім паходжанні належаць да арабскай ювелірнай індустрыі. Патрапіўшы на нашы землі, яны захавалі арабскую форму, але арабская тэхніка іх вырабу хутка была забытая. Кольцы пачалі ў XI ст. вырабляць не са срэбра, а са сплаваў. Паверхня кольцаў мае сляды зерні, але не прыпаянай, як у арабаў, а адлітай адразу. Гэтыя вырабы больш грубыя па тэхніцы выканання. Некалі трапіўшы да племяннай эліты, скроневыя кольцы дэмакратызаваліся праз матэрыял і тэхналогію.

Такім чынам, паходжанне радзіміцкіх скроневых кольцаў зусім не звязанае з праблемай паходжання радзімічаў. Іншаземныя ўпрыгожанні сталі толькі ўзорамі для мясцовых майстроў. Мода існавала і тады, толькі ўздзейнічала яна выбарачна, на пэўныя этнічныя супольнасці. Гэтыя кольцы, імпартныя па сваёй сутнасці, так спадабаліся радзімічанкам, што пазней сталі ўспрымацца як іх этнічная адметнасць.

### Хаты і курганы

Здзіўляе археолагаў тое, што радзімічы жылі ў наземных дамах, а не ў паўзямлянках, як іншыя славяне. З гэтай нагоды Валянцін Сядоў пісаў, што гэты звычай мог быць вырацаваны ўжо ў Пасожжы, не без уплыву мясцовых балтаў. Праўда, разважае далей расійскі археолаг, у найбольш ранніх пасожскіх паселішчах радзімічаў мусілі б трапляцца і паўзямлянкі. Але паўзямлянкачных паселішчаў у Пасожжы не было выяўлена.

Агульнаславянскі пахавальны звычай — размяшчэнне памерлых галавой на захад. У радзіміцкіх землях часта мужчынаў клалі галавой на ўсход. Гэта выразна відаць у парных пахаваннях, дзе нябожчыкі пакладзены галовамі ў розныя бакі. Хоць такія курганы сустракаюцца на тэрыторыі шырэйшай, чым толькі арэал рассялення радзімічаў.

Сярод рэчаў, знойдзеных у радзіміцкіх курганах, вылучаюцца шыйныя грыўны — абручы, канцы якіх заходзяць адзін за адзін і ўпрыгожаныя разеткамі. Найбліжэйшыя аналагі такіх грыўнаў вядомы ў балцкіх старажытнасцях Латвіі і Літвы. Таксама балцкімі па паходжанні з'яўляюцца змеегаловыя бранзалеты. Знаходзяць у радзіміцкіх курганах і металічныя спіралькі, характэрныя для латгальскага касцюма.

Гэтыя знаходкі выглядаюць заканамерна. Пачатак II тысячагоддзя нашай эры быў перыядам змешвання балта-славянскага насельніцтва. Адно што ў радзіміцкіх курганах XI—XII стст. балцкія элементы знаходзяць часцей, чым у іншых абласцях Верхняга Падняпроўя і Падзвіння. Хутчэй за ўсё, гэты факт адлюстроўвае больш позняю славянізацыю балтаў ля басейна Сажа. Калі ў смаленска-полацкіх крывічоў балцкія элементы шматлікія ў VIII—X стст., а пазней іх колькасць змяншаецца, дык у радзіміцкім Пасожжы прадметы балцкага тыпу застаюцца звычайнымі ў курганах XI—XII стст.

### Этнічнае паходжанне

Да сярэдзіны I тысячагоддзя нашай эры Пасожжа, як і большасць тэрыторыі Беларусі, стала арэнай перасяленняў. Гэтаму папярэднічала пагаршэнне клімату ў Цэнтральнай Еўропе. Праз павелічэнне вільготнасці і пахаладанне падвысіўся ўзровень вод, многія тэрыторыі сталіся непрыдатнымі для земляробства.

Насельнікі берагоў Віслы, сярод якіх былі заходнія балты, рушылі на ўсход. Перасяленцы не знікалі сярод мясцовага ўсходнебалцкага насельніцтва Беларусі, прыносілі яму шмат супольнаеўрапейскіх рысаў таго часу, што асабліва добра ілюструецца строямі, якія рэканструююцца паводле археалагічных знаходак.

Частка гэтых заходніх балтаў, а маюцца на ўвазе яцвягі і голядзь, дайшла да Пасожжа. Такія самыя дэталі пахавальнага абраду як на Белай Гары ў Чачэрскім раёне гомельскі археолаг Алег Макушнікаў знаходзіць у міжрэччы Эльбы і Віслы. Частка заходніх балтаў пайшла далей на ўсход — на Аку. Гэтая супольнасць будзе вядомая ў рускіх летапісах як голядзь, што дасць пачатак таксама летапісным вяцічам.

Антрапалагічнае вывучэнне пахаванняў сведчыць, што яцвягі, радзімічы, вяцічы і падмаскоўная голядзь маюць падобны фізічны тып, паходжанне якога звязваецца з заходнімі балтамі. Маскоўскі лінгвіст Георгій Хабургаеў, мяркуючы па гідраніміі (назвах рэк) Пасожжа, адносіў мову даславянскага насельніцтва гэтага рэгіёна да яцвяжскіх (заходнебалцкіх) дыялектаў.

Яшчэ адна частка мігрантаў рушыла праз Падняпроўе і Падзвінне на поўнач ды дасягнула ўсходняй Латвіі, утварыўшы латгальскі этнас. Можа падацца нечаканым, але продкі радзімічаў этнічна і культурна найбольш блізкія сярод захаваных этнасаў да латгалаў, ад племяннай назвы якіх ужо пазней немцы ўтварылі назву краіны — Латвія.

Археолагі даўно заўважылі падабенства ўпрыгожанняў радзімічаў і латгалаў (прамяністыя фібулы і падвескі). Адрозненні толькі ў дэталях — латгальскія вырабы маюць вострыя канцы, а радзіміцкія — больш закругленыя. У дэталях таксама адрозніваюцца падвескі з выявай галавы тура (быка).

У сваю чаргу, праз 400—500 гадоў, у IX ст. у Пасожжа пачынаецца славянская экспансія, вядомая сярод археолагаў як пашырэнне Лука-Райкавецкай культуры. Напрыклад, шырокае рассяленне славян у ваколіцах летапіснага Гомія (Гомеля) адносіцца да IX—X стст. — да другой хвалі славянскай экспансіі ў наш рэгіён. Такім чынам, нашчадкі заходнебалцкіх перасяленцаў з Віслы («з ляхаў»), якія засталіся ў Пасожжы і былі аславяненыя, і ўвайшлі ў гісторыю як радзімічы.

Кіеўскі летапісец Нестар не ведаў, як даць рады радзімічам — да якіх з «языкоў» іх адносіць. Напачатку летапісу Нестар пералічвае ўсе славянамоўныя, фіна-вугорскія ды ўсходнебалцкія супольнасці, але пазбягаў моўнай характарыстыкі заходніх балтаў (прусаў, ятвягаў, голядзі). Таксама летапісец не далучаў ні да адной моўнай групоўкі радзімічаў. Апошні раз летапісы прыгадваюць радзімічаў пад 1169 г. ужо як этнаграфічную адзінку ўсходняга славянства — русі.

Славянізацыя гэтая адбывалася не толькі праз прыток славянскіх пасяленцаў, даволі абмежаваны, але праз актыўную палітыку Кіева і яго варажска-рускай эліты ў гэтым рэгіёне — падатковую і рэлігійную.

У нашым далейшым гістарычным падарожжы ўжо не абыйсціся без хазараў і русі.

# Цаню гэту літаратуру над усе жанры

Піша **Арсень Ліс**.

Літаратура наша, беднаватая на мемуарыстыку, апошнім часам стала ўзбагачацца гэтым самавітым жанрам. Услед за кнігай успамінаў незабыўнага Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому» пражытым-перажытым падзяліліся Ніл Гілевіч і Алесь Петрашкевіч. Пасмяротна апублікаваныя мемуары пісьменніка і грамадскага працаўніка Васіля Блакіта. Пабачылі свет успаміны мастакоў Васіля Шаранговіча, Кастуся Харашэвіча, вандроўніка па свеце Васіля Стомы, які з добрай непасрэднасцю расказаў, было тое надрукавана ў «Полымі», пра жыццё даваеннага мястэчка на Дзісеншчыне.




**Белая С. Да роднага ганку**: з журналісцкага нататніка пачатку 1990-х. Гутаркі з віленскімі беларусамі Амерыкі. — Мінск, 2009.

У кнізе з інтрыгоўнай назвай «Мой шыбалет» распавядае пра сябе і час былы амбасадар у Германіі, дэпутат Вярхоўнага савета XII склікання Пётра Садоўскі. У дзвюх кнігах дзеліцца з чытачом палітычнымі дасведчаннямі першых гадоў незалежнасці тагачасны міністр замежных справаў Пятро Краўчанка.

Сумна ўсведамляць, што пайшло з жыцця многа самавітых постацяў, не пакінуўшы па сабе такіх незаменных памятак. Толькі пачаў пісаць успаміны гісторык Мікалай Улашчык. Надзвычай багатае, драматычнае сваё жыццё не паспеў даверыць пяру мемуарыста акадэмік Гаўрыла Гарэцкі. Ніхто не даўмеўся запісаць успамінаў уладароў спеўных галасоў Ларысы Александроўскай, Міхася Забэйды-Суміцкага, якія вывелі беларускую песню ў шырокі свет.

У пажылым веку цэніш гэту літаратуру над усе жанры. Пры нагодзе намаўляю патэнцыйных мемуарыстаў не адкладваць напісанне ўспамінаў на потым...

Рады новым публікацыям. Вось і днямі з цікавасцю прачытаў успаміны, сабраныя журналісткай і пісьменніцай Святланай Белай. Некалькі старых беларускіх інтэлігентаў адказваюць на пытанні інтэрв'юера, разважаюць-настальгуюць...

Старэйшая сярод эмігрантаў Эмілія Шабуня з роду Луцкевічаў, ейная дачка Яніна Каханоўская з сентыментам успамінаюць родны дом у Мінску побач з домам Купалы, згадваюць жорсткія жыццёвыя акалічнасці 1930—1940-х.

У кнізе «Да роднага ганку», аднак, пераважаюць згадкі пра даваенную Вільню, беларускае жыццё там. Абразкі яго ўстаюць з успамінаў Вітаўта Тумаша, які на чужыне здолеў стаць вучоным. Вельмі інфарматыўныя ўспаміны, атрыманыя ад Міколы Шчорса, аднаго з кіраўнікоў Беларускага студэнцкага саюза, што існаваў пры Віленскім універсітэце.

Разгорнутая карціна жыцця універсітэта ў 1930-я паўстае з інтэрв'ю з Антонам Шукелойцем. Ён падрабязна згадвае выкладчыкаў, добрых і рэакцыйна настроеных рэктараў, Таварыства беларусаведы і этнаграфічны музей, працу Студэнцкага саюза і Хор Шырмы пры ім, паэтаў Танка, Бярозку, Арсенневу, часопіс маладой дэмакратычнай думкі «Золак». Мемуар гэтага патрыярха інтэлігенцыі на эміграцыі ў кнізе найпаўнейшы, найбагацейшы, на абсяг ахопленага часу, факты, рэаліі яго.

Ніводзін з аўтараў не абмінуў увагай Віленскай беларускай гімназіі. Была яна ў даваеннай Польшчы асветным беларускім агнішчам, рэдутам супраціву паланізацыі. Моцная педагагічным складам — дастаткова згадаць імёны Гарэцкага, Тарашкевіча, Луцкевіча, Дварчаніна — яна сталася сапраўднай кузняй беларускай інтэлігенцыі: паэтаў, мастакоў, асветнікаў, палітыкаў. Аналагам ёй у 1920-я быў хіба Белпедтэхнікум у Мінску, дзе выкладалі Колас, Ігнатоўскі, Лёсік.

Кніга ілюстраваная фотаздымкамі 1920 — 1940-х, надрукаванымі ўпершыню.

Мемуары «Да роднага парогу» кідаюць крыху святла на гісторыю беларускай інтэлігенцыі, нашай асветы, культуры, літаратуры нялёгкай пары. І гэтым яны цікавыя і карысныя сучаснікам. Кніга каштоўная. Шкада толькі, рэдактура пакідае жадаць лепшага.

# Калі мёртвыя пачынаюць бунтаваць

Літаратуразнаўца **Міхась Тычына** апавядае пра раман Віктара Казько «Бунт незапатрабаванага праху».

Інтэрпрэтацый таго, што напісаў Віктар Казько, можа быць шмат. Многія лічаць пісьменніка сучасным беларускім міфолагам накшталт Маркеса.

У рамане няма сюжэтнага развіцця падзей, як у баевіку, дзе абавязкова на другой старонцы адбываецца забойства. А далей ужо чытач узяты ў палон. У Віктара Казько сюжэт вырастае як у таго, хто піша вершы — нечакана. Словы нараджаюць словы, і такое пляценне ўзнікае, што з яго выбрацца надзвычай цяжка.

Казько адзін з нямногіх пісьменнікаў, хто адчувае жахлівую складанасць свету, у якім з'явіўся чалавек. Галоўны герой рамана, Макрыян Говар, аб'ездзіў увесь свет. Як і Віктар Казько некалі аб'ехаў Савецкі Саюз. І не адразу да яго прыйшла думка, што трэба вяртацца туды, адкуль пачалася ягоная жыццёвая дарога. Вось і галоўнага героя рамана чакаюць у момант вяртання на радзіму адказы на пытанні, якія ён шукаў, блукаючы па вялікім свеце.

Галоўнае пытанне — хто яго бацька. У архівах яму паведамляюць, што няма такога Говара, які мог бы быць ягоным бацькам. Праўда адкрываецца выпадкова: бацьку арыштавалі ў 1937 годзе. Айчым пазней паказвае Макрыяну паперу, у якой паведамляецца афіцыйная і, зразумела, хлуслівая версія: «Скончался от сердечной недостаточности в 1954 году. Прах не востребован. Похоронен...» Вось разгадка назвы гэтага рамана — «прах не востребован».




**Казько Віктар. Бунт незапатрабаванага праху.** Раман — Мінск: Логвінаў, 2009. — 340 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

А бунт — гэта ўсё жыццё героя. Макрыян Говар не ведае, адкуль ён, хто ён, у чым сэнс ягонага жыцця. І пошук адказаў на такія пытанні, без якіх чалавек проста не можа існаваць, узводзіцца аўтарам на узровень усёй зямной цывілізацыі. Куды гэта ўсё сыходзіць? З праху выйшаў — у прах пайшоў. Але раптам мёртвыя пачынаюць бунтаваць. Яны патрабуюць не толькі памяці аб сабе, але і таго, каб жывыя задумваліся: «А як я жыву?» Як так адбываецца, што жыццё, дадзенае нам Богам, мы марнуем на немаведама што?

Алесь Адамовіч у кнізе «Вайна і вёска ў беларускай літаратуры» Віктара Казько параўнаў з Валянцінам Распуціным. Адзін піша пра вытратванне Байкала, расійскай прыроды. У Казько гэта таксама ідэя фікс — паратунак роднай зямлі. Вось твая Бацькаўшчына, вёска, дзе ты нарадзіўся, тая хата, хоць ад яе амаль нічога і не засталося. Але яе можна аднавіць і жыць. І ў канцы кнігі мы бачым ужо састарэлага Макрыяна Говара і ягоную жонку, з якой ён нарэшце памірыўся. Яны жывуць сярод роднай палескай прыроды, няхай сабе і радыёфікаванай. Але яны шчаслівыя.

«Бунт незапатрабаванага праху» не з тых раманаў, якія людзі адразу кідаюцца чытаць. Калі згадаць Маркеса, папулярнасць яго рамана «Восень патрыярха» была надзвычайнай. Але ён надта цяжка чытаецца. Я, напрыклад, недзе на палове кінуў. Уражанне было такое, што ўсё ідзе па колу. Гэта прымушала пакутаваць.

Сучасны чытач у пагоні за легкаважным чытвом свядома адштурхоўвае ад сябе кнігі, якія прымушаюць думаць. Найперш пра самога сябе. Віктар Казько з тых, хто вядзе свой карабель не на мяльчак, а на глыбіню чалавечай думкі.

Адказ на пытанне «Што такое літаратура?» вядомы даўно — мысленне вобразамі. Дык большасць пісьменнікаў акцэнт робіць на слове «вобразы», а Казько важна зрабіць націск на слове «мысленне».

**Запісаў Кастусь Матушыч**

# Нямцэвічы. Сапраўднае жыццё

Піша **Наталка Бабіна**.

Бібліятэка краязнаўчых кніжак папоўнілася новым выданнем. Яго падрыхтаваў і здзейсніў дацэнт-фізік і вядомы краязнаўца з Брэста Анатоль Гладышчук.

Кніга прысвечаная гісторыі вядомага ў Беларусі роду Урсын Нямцэвічаў і складаецца з мемуараў Юльяна Урсын Нямцэвіча (1758—1841) — палітычнага дзеяча, сакратара-ад'ютанта Тадэвуша Касцюшкі, пісьменніка; а таксама з раздзелаў, дзе расказваецца пра сённяшні дзень Брэста і ваколіц — мясцін, дзе на працягу стагоддзяў жылі Урсын Нямцэвічы.

Мемуары вельмі жывыя. Аўтар расказвае і пра дзеда Аляксандра з Клейнікаў, у доме якога гасцям падаваліся «боршч, запраўлены смятанай, флякі, смажаніна гусарская і іншыя падобныя прысмакі», і пра тое, як дзед, «пабачыўшы сябе так шматаблічна ў пакаленні нашым адроджаным», вынес са скарбніцы і падарыў кожнаму ўнуку і ўнучцы па 2000 тынфаў, і пра набожнага бацьку Марцэлія, што любіў разам з ксяндзом з Вістыч «пастраляць па ластаўках», і пра найлепшую ў свеце маці Ядвігу... Ёсць у мемуарах і апісанне старога Брэста — таго, што знаходзіўся на месцы сённяшняй крэпасці, цяпер знішчанага.

Жыццё горада было насычаным і складаным: прапаведнікі ў сямі касцёлах дабіваліся, каб «людзі станавіліся лепшымі», хлопчыкі-габрэі прадавалі паштучна лімоны, і яшчэ заставаліся ў горадзе два майстры, што ўмелі рабіць сагайдакі...

Цікавая глава пра графа Флемінга, які, будучы выхадцам з сям'і, што прыехала ў ВКЛ з Галандыі, шмат зрабіў для пад'ёму гаспадарчага жыцця Брэстчыны. Рэзідэнцыя Флемінга была ў Тэрэспалі, названым так, аказваецца, у гонар Тэрэсы Слушкавай... (А савецкая этымалогія, да слова, выводзіла, што Тэрэспаль названы так таму, што быў «цераз поле» ад Брэста!).

Шмат увагі аўтар аддае тлумачэнню трагічнай сваёй эпохі — часу падзелаў Рэчы Паспалітай... Караль Радзівіл (Пане Каханку), апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, гетман Агінскі і шмат хто яшчэ паўстаюць у мемуарах вельмі выразна...




**Гладышчук Анатоль. Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі:** гісторыка-дакументальны нарыс — Мінск: Литература и искусство, 2009. — 288 с: іл.

Мала захавалася ад той эпохі. Толькі панылы дачнік корпаецца на полі, дзе стаяла калісьці капліца Марыі Егіпецкай, дзе была алея драўляных святых. Толькі незразумелая назва Рахвал ды пусты стоўп, прызначэння якога доўгі час ніхто не ведаў, засталіся ад скульптуры святога Рафаіла. Толькі пустыя сцены стаяць на месцы палаца Нямцэвічаў у Скоках, дзе некалі была пастаўленая кропка ў Першай сусветнай вайне. Але ёсць надзея, што, дзякуючы дзейнасці такіх неабыякавых і таленавітых людзей як спадар Гладышчук, гэта ўсё не кане ў бяздонную раку часу.




## КАНЦЭРТЫ

**Раство прыходзіць — радасць прыносіць**

**21 снежня ў Малой зале філармоніі імя Рыгора Шырмы (пр. Незалежнасці, 50)** — канцэрт «Раство прыходзіць — радасць прыносіць» у выкананні ансамбля салістаў «Класік-Авангард». **Пачатак а 19-й.**

**Neuro Dubel**

**17 снежня а 19-й у «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт гурта Neuro Dubel.

**Разбітае сэрца пацана**

**20 снежня а 19-й у «Графіці»** ж выступае «Разбітае сэрца пацана». Спевы на трасянцы, кардэбалет на мяжы фолу.

**Флэшквартэт**

**17 снежня а 19-й у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі** пачнецца канцэрт з нагоды шведскага нацыянальнага свята Люсіі і заканчэння тэрміну шведскага старшынства ў ЕС. «Флэшквартэт» — легендарны шведскі струнны ансамбль, музычны стыль якога дакладна можна апісаць як «ф'южн», бо ён вар'юецца ад вытанчанага выканання класікі і джазу да эксперыментальнага року.

**Фартэпіянная музыка на Каляды**

**У Філармоніі (пр. Незалежнасці, 50) 17 снежня** адбудзеца канцэрт фартэпіяннай музыкі «Каляндны феерверк». **Пачатак а 19-й.**

**Dark Tranquillity**

**20 снежня ў мінскім клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** зайграе легенда метал-сцэны Dark Tranquillity (Швецыя). **Пачатак а 19-й.**




## ІМПРЭЗЫ

**Кніжны кірмаш**

**18 снежня а 18-й адчыніцца Калядны кніжны кірмаш (пр.Машэрава, 8).** Адбудзецца падсумаванне вынікаў літаратурнага года, можна будзе сустрэцца з любімымі аўтарамі, атрымаць аўтографы. Падчас вечарыны пройдзе выстава «Беларуская кніга-2009» і кніжны распродаж ад выдаўцоў.

**Расклад вечарыны:**

**18.00 — 18.25** Анатоль Івашчанка, Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»

**18.25 — 18.50** Уладзімір Сіўчыкаў, выдавецтва «Радыёла-плюс»

**18.50 — 19.15** Павал Мажэйка, «Гарадзенская бібліятэка»

**19.15 — 19.30** адкрыццё выставы «Беларуская кніга-2009»

**19.30 — 20.00** Валер Булгакаў, Віталь Рыжкоў, Наталка Бабіна, часопіс ARCHE і яго выдавецкая серыя

**20.00 — 20.30** Вольга Гапеева, Арцём Кавалеўскі, Віктар Ыванoў, Сяргей Календа, Міхась Башура, выдавецтва «Галіяфы»

**20.30 — 21.00** Алесь Кудрыцкі, «Кнігарня «Наша Ніва»

**21.00 — 21.30** Уладзімір Арлоў, выдавецтва «Логвінаў»

**21.30 — 22.00** выступ гурта ZnaROCK

## ВЫСТАВЫ

**Выстава прац Юдаля Пэна**

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 31 студзеня** працуе выстава «Калекцыя прац Пэна», прысвечаная 155-годдзю з дня народзінаў мастака. Выстаўляюцца зборы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Гэта першая выстава твораў славутага Юдаля Пэна ў Мінску.

**Лялькі і цацкі Анастасіі Герасімовіч**

**Ад 17 снежня да 26 студзеня ў Доме Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а)** будзе працаваць Калядная выстава Анастасіі Герасімовіч, аўтаркі цікавых інтэр'ерных лялек і цацак.

**Графіка Сяргея Цімохава**

**17 снежня** — апошні дзень працы выставы графікі Сяргея Цімохава, што ідзе ў Палацы мастацтва.

**Маэстра эстампа**

**У Мастацкім музеі да 15 студзеня** працуе выстава «Дзмітры Малаткоў. Маэстра эстампа».

**Іранскія традыцыі і звычаі**

**У Нацыянальнай бібліятэцы** працуе выстава, прысвечаная іранскім традыцыям і звычаям.

## ТЭАТРЫ

**17 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**18 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»

**19 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

**20 снежня**

**Тэатр оперы і балета** — «Церамцерамок»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

**18 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»

**19 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

**20 снежня**

**Тэатр оперы і балета** — «Церамцерамок»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

**22 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

**23 снежня**

**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»

**24 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр імя Горкага** — «Нінaчка»

**25 снежня**

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка




## КІНО

# Пахавайце мяне за плінтусам

Расія. 116 мін. Драма. Толькі з 16 гадоў.
**Рэжысёр:** Сяргей Снежкін.
**У ролях:** Саша Драбіцька, Святлана Кручкова, Аляксей Пятрэнка, Марыя Шукшына, Канстанцін Вараб'ёў.




1983. Хлопчык-другакласнік жыве з дзедам і звар'яцелай бабкай, якая не дае ўнуку бачыцца з ягонай роднай маці, дапякае прыдзіркамі, не пускае ў школу, таму што там зараза, і сілком корміць лекамі ад усіх магчымых хвароб. У дзень нараджэння хлопчык спадзяецца ўбачыць маці, а тая са сваім новым мужам-алкаголікам сядзіць у сталоўцы насупраць бацькоўскага дома і чакае, калі ёй дазволяць павіншаваць сына.

Экранізаваць добрыя кнігі цяжка, а такія папулярныя як аповесць Паўла Санаева «Пахавайце мяне за плінтусам» — наогул самазабойства.

Кожны чытач абавязкова тыцне пальцам: а вось гэта ў кніжцы было не так!

«Плінтус» быў напісаны з пункту гледжання дзіцяці, і гэта была аповесць аб вялізнай, знішчальна сямейнай любові — досведзе, у якім няма месца логіцы і «нармальнасці». Снежкін мяняе скіраванасць погляду.

Павел Санаеў — выхадзец з акторскай сям'і, унук Усевалада Санаева, сын Алены Санаевай і пасынак Ралана Быкава. Таму фільм — не экранізацыя аповесці, а хутчэй байопік на тэму «дзяцінства Паўла Санаева». Марыя Шукшына і Канстанцін Вараб'ёў са сваімі танцамі ў сталоўцы намякаюць на сталых сумных лісу Алісу і Ката Базіліо, а Аляксей Пятрэнка іграе не проста дзядулю, а вялікага савецкага акцёра.

Адна Святлана Кручкова заходзіцца ў істэрычным прыпадку, не думаючы ні пра якія прататыпы.

Гэтая бясконцая істэрыка становіцца ўсё пакутлівейшай з кожнай хвілінай. Увесь фільм — суцэльны стан афекту, так што назва «Пахавайце мяне за плінтусам» успрымаецца як мальба дзіцяці пазбавіць яго ад гэтага кашмару. У кнізе, дарэчы, было інакш. Хлопчык прасіў маму пахаваць яго за плінтусам, тлумачачы: «Я хачу заўсёды цябе бачыць».

**«Газета.ру»**

# Літоўская фатаграфія

У кінатэатры «Цэнтральны» (пр. Незалежнасці, 13), аўтацэнтры «Кіа Атлант-М Баравая» (Баравая, 2, шоу-рум), «Цэнтры-відэа» да 22 снежня працуе выстава «Літоўская прэс-фатаграфія».

Літоўскія фотарэпарцёры даўно адышлі ад стандартаў турыстычных паштовак і адлюстравання бесклапотных ідылій новаеўрапейскага краю.

Серыя пра залеву: вось мужчына сядзіць у залітай вадой хаце ў атачэнні старой мэблі, такой, якой поўняцца і беларускія хаты. Трактар «Беларусь» адольвае затопленую дарогу, хлопчык дастае ката з даху, а на фоне — закруткі ў слоіках на падваконні. Ці іншы пагляд: пажар у касцёле, дым, на зямлю падае вежа ў агні. Важна-няважна? Гэта жыццё краіны, якое фотакарэспандэнт павінен адлюстроўваць. Няхай гэта не драма вайны ў Іраку, няхай не карнавал у Рыа, але маленькія рэчы,якія ў маштабе маленькага краю набываюць значнасць.

Прафесійнае журы Клуба прэс-фатографаў Літвы праводзіла адбор найлепшых здымкаў, якія сфармавалі выставу. Спецыфікай быў шырокі дыяпазон жанраў фатаграфіі. Не толькі традыцыйныя «Навіны», «Культура», «Спорт», але таксама «Армія», «Прырода і абарона навакольнага асяроддзя», «Партрэт», «Гламур».



Магчыма, менавіта гэтыя жанры дадаюць незвычайнасці выставе. Ёсць кадры пастановачныя, ёсць партрэты і нават арт-хаусные. «Гламурная» частка прадстаўленая ў сімвалічным месцы: у аўтамабільным цэнтры. Даць плошчу пад выставу прапанаваў сам дырэктар цэнтра, вялікі аматар фатаграфіі.

На жаль, здымкі не суправаджаліся назвай і кантэкстам выявы, праз што многае застаецца незразумелым ды двухсэнсоўным для беларускага гледача. Аднак арганізатары паабяцалі выправіцца да наступнай выставы лепшых прэс-фота Літвы-2009, што мае адбыцца ў лютым-сакавіку наступнага года.

**Стася Мініч**

# Беларусь ставіць на Украіну

**Выбары ва Украіне — рэдкая палітычная падзея, якая зацікавіла беларускіх букмекераў.**

У пастанове Савета міністраў, якая рэгламентуе правілы букмекерскіх гульняў, адзначана, што прагнозы «могуць тычыцца спартовых, культурных і іншых сацыяльна значных падзей». Тым не менш, большасць з 175 зарэгістраваных у краіне букмекерскіх кантор працуе толькі са спортам. А ў Брытаніі, напрыклад, грошы можна выйграць нават угадаўшы, што заўтра пойдзе снег. Зрэшты, на заходніх інтэрнэт-таталізатарах могуць гуляць і беларусы. Тут і выбар падзей шырэйшы, і колькасць гульцоў большая.

Апроч спартовых падзей, беларускія букмекеры прымаюць стаўкі на «Еўрабачанне», «Славянскі базар», іншыя музычныя конкурсы. Палітычны таталізатар, распаўсюджаны ў Еўропе і ЗША, у нас пакуль асаблівай папулярнасці не здабыў. Між тым, у часе выбараў новага Папы стаўкі на пераможцу прымаліся проста на плошчы Святога Пятра ў Рыме...

Адзін з найбуйнейшых еўрапейскіх парталаў bwin.com некалькі дзён таму змясціў лініі ставак на прэзідэнцкія выбары ва Украіне, якія адбудуцца праз месяц. Найбольшыя шанцы, паводле ставак, у Віктара Януковіча. Яго каэфіцыент — 1:1,67 (пры стаўцы ў $100 выйгрыш складзе $167). У Юліі Цімашэнка каэфіцыент складае 2,07. Калі ж зноў перамажа Віктар Юшчанка, яго прыхільнікі атрымаюць у 27 разоў больш, чым паставілі. Што сведчыць пра слабую веру гульцоў у ягоную перамогу.



### На Юлю — 1:2

Ці прымаюцца ў Беларусі стаўкі на ўкраінскія выбары? У большасці кантор карэспандэнту «НН» адказвалі, што палітыкай не цікавяцца. Яшчэ дзве кампаніі, магчыма, створаць лінію перад самымі выбарамі. А вось кампанія bet.by ўжо стварыла. На перамогу Юліі Цімашэнкі яны даюць 1:2. Паводле словаў прадстаўніка кампаніі, ставак на палітыку прымаецца вельмі мала — азарт гульні ўласцівы перадусім спартовым заўзятарам.

Асаблівасць беларускага букмекерскага рынку ў тым, што асноўныя кампаніі на ім — філіялы расійскіх і ўкраінскіх гігантаў. Сур'ёзную канкурэнцыю ім складае хіба віцебскі «Плюс-мінус». А ў Расіі на палітычным таталізатары падчас выбарчых кампаній гуляць забаронена. Рэдка калі стаўкавыя лініі распрацоўваюцца спецыяльна для Беларусі.

Бліжэйшая, пасля ўкраінскіх выбараў, з найбуйнейшых неспартовых падзей — цырымонія ўручэння «Оскараў». Яна адбудзецца ў сакавіку, але стаўкі на пераможцаў у Еўропе прымаюцца ўжо зараз.

**Ягор Марціновіч**

**Наша страва**

## Суп рускі, або «юшка», посны

1,25—1,5 кг любой вялікай рыбы, 2—3 лаўровыя лісты, колькі зярнятак перцу, маяран, 2 морквы, 1 пятрушка (корань), 1 сельдэрэй, 1 цыбуля-парэй, 1—2 цыбуліны, соль па смаку

Рыбу абліць варам, вар зліць. Потым закіпяціць 1,5—2,5 л вады, дадаўшы карэнні і спецыі, і гатаваць на малым агні гадзіну. Рыбу адварыць да гатоўнасці асобна, парэзаць на кавалкі. Дадаць у адвар карэнне і спецыі, кавалкі рыбы, закіпяціць і адразу ж падаць на стол.

З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

ЗДАРОЎЕ

# Як выратаваць вочы ад камп'ютара

Калі прасядзець цэлы дзень за камп'ютарам — да вечара вочы стомяцца так, што ўжо ні тэлевізар паглядзець, ні кніжку пачытаць. Калі ж цягам дня выконваць няхітрыя рэкамендацыі, стомленасць вачэй рэзка зменшыцца.

Варта часцей міргаць падчас працы за камп'ютарам, каб пазбегнуць высыхання рагавіцы. Існуе шэраг прэпаратаў для звільгатнення рагавіцы, пры неабходнасці выкарыстоўвайце іх.

Трэба рабіць перапынкі. Пасля гадзіны за камп'ютарам абавязкова зрабіце перапынак на 5—10 хвілін. Папіце гарбаты ці выйдзіце прагуляцца на вуліцу.

Не забывайцеся на вітаміны. Асабліва летам, калі чарніцы можна есці ў натуральным выглядзе. Вашыя вочы аддзячаць зоркасцю за смачныя ягады.

Таксама паспрабуйце рабіць гімнастыку для вачэй. Можна нават не адыходзячы ад кампу-



тара:

1. Моцна заплюшчыце вочы на 3—5 секунд, а потым шырока іх расплюшчыце на 3—5 секунд. Паўтарайце.

2. Пастаўце вялікі палец рукі на адлегласці 30 см ад вачэй. Глядзіце на канец пальца на працягу 3—5 секунд, заплюшчыце адно вока на 3—5 секунд, расплюшчыце, заплюшчыце другое вока. Паўтарайце.

3. Пакладзіце кончыкі пальцаў



на скроні, злёгку націсніце. Міргніце хутка і лёгка 10 разоў, затым заплюшчыце вочы і адпачніце. Паўтарыце 3 разы. Практыкаванне здымае стому. Правядзіце зрокам па колу 4—5 разоў па гадзіннікавай стрэлцы і супраць яе.

4. Каб расслабіць вочы, зрабіце практыкаванне, якое часам называюць «знак на шыбе». На ўзроўні вачэй на шкло прыляпіце круглы знак, дыяметрам каля 1 см. Ён можа быць любога колеру, абы быў добра бачны. Падыдзіце блізка да акна (каб адлегласць была сантыметраў дзесяць) і пагледзіце некалькі секундаў праз акно ўдалеч — на дрэвы і будынкі, якія знаходзяцца як найдалей, а пасля пагледзіце некалькі імгненняў на знак. Затым зноў удалеч, потым яшчэ на знак. Паўтарайце.

Згубіць зрок лёгка, а ўзнавіць амаль нерэальна. Беражыце вочы!

**НШ**

**Прыватныя абвесткі**

**ВІТАННІ**

**Віншую ўсіх сапраўдных Беларусаў з Новым Годам!** З павагай Мікола Заяц.

**Шэрая панда, віншуем цябе!** Валанцёра №1, барда і проста добрага сябра Міколу Рудакоўскага віншуем з Днём народзінаў. Жадаем моцнага здароўя, творчых планаў і здзяйснення ўсіх тваіх мар! БАСА і змена незалежных назіральнікаў.

**СВЯТОЧНЫЯ СТРОІ**

**Дапамагу стварыць** святочныя і штодзённыя строі для дарослых і дзяцей. Т.: (029) 353-73-06, Наталля.

**КАЛЯНДАР**

**Найлепшы падарунак на Новы год — гістарычны каляндар,** прысвечаны 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. Пытайцеся ў кнігарнях Мінска, на кніжных кірмашах і ў незалежных распаўсюдніках.

**НАБУДУ**

**Факсімільнае выданне «НН»** за 1909 г. Лістуйце на: douhiles@rambler.ru (Анатоль Сідарэвіч).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

# Антыкрызісная пушыстая ягада

**Спелы ківі не мусіць быць надта цвёрдым ці надта мяккім.**

Ківі з'явіўся на свет дзякуючы сусветнаму прамысловаму крызісу 30-х гадоў XX ст. У далёкай Новай Зеландыі партовы клерк Джэймс Маклоклін паспрабаваў асвоіць новую для сябе прафесію фермера. Аднак лімоны, якія ён вырошчваў, не мелі папулярнасці. Сусед Маклокліна, Аляксандр Элісан, акультурыў кітайскі агрэст і вырасціў новы плод. Аптыміст Маклоклін узяўся за знаходку суседа і пачаў вырошчваць на сваіх плантацыях незвычайныя ягады, пра карысныя якасці якіх і не здагадваўся.

Кітайскі агрэст стаў вельмі папулярным, а заснавальніку першай плантацыі прынёс неблагі прыбытак. Ягада зрабілася нават сімвалам Новай Зеландыі і атрымала назву ківі — у гонар птушкі, якая існуе выключна ў гэтай краіне.

Ківі надзвычай багаты на вітамін С.



Таксама ківі можа дапамагчы:

- унармаваць ціск, бо ўтрымлівае багата калію;
- актывізаваць працу кішэчніка і рассмоктваць тлушчы;
- панізіць рызыку стварэння тромбаў;
- спаліць тлушчы, бо мае адпаведныя энзімы і шмат клятчаткі.

Калі набываеце ківі, абавязкова памацайце пухнаты плод. Ён не павінен быць надта цвёрдым ці надта мяккім. Пахнуць ён павінен суніцамі. Аднак не забірайце той, што мае пах віна — гэта прыкмета праспеласці.

Ківі можна дадаць у салатку, да мяса ці з'есці проста так. Найлепш — за паўгадзінкі да абеду, сняданку ці вячэры.

**Настасся Шамрэй**

# Газетка дзеткам



НА РЭЧЦЫ ЗІМОЮ

Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому:
Кліча яго рэчка, цягнуць санкі з дому.
— Мамачка-галубка! — просіць сын так міла.
— Можа б, ты на рэчку пагуляць пусціла?
Я не буду доўга, зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы ў санках паважуся.
— Ну, ідзі пабегай, толькі апраніся
Ды, глядзі, ў палонку, сынку, не ўваліся.
Радасць і раздолле хлопчыку малому
І не пазайздросціць ён цяпер нікому!
На плячо — сякерку, саначкі — у руку,
Хлеба ўзяў акрайчык. — Цюцік! — свіснуў Жуку.
Пад скарынкай лёду тут жа, каля хаты,
Працякала рэчка скрозь лясныя шаты.
Побач той рачулкі кучы буралому,
І застыла рэчка мёртва, нерухома.
— Эй ты, лёд-гвалтоўнік! Што ты вытвараеш?!
Ты нашто вадзіцу крыўдзіш, ушчуваеш?
Дам ёй ход, дарогу, каб на свет зірнула!
І яго сякерка спрытна секанула.
Звякае сякерка, глуха стук нясецца.
Раптам клуб вадзіцы з-пада дна ўзаўецца.
Коціцца вадзіца, іней падымае
Ды такую казку-байку хлопцу бае!
На рачулцы ў лесе меў Алесь забаву.
Ну ж і пацяшаўся хлопчык тут на славу!

**Якуб Колас**

Больш вершаў на dzietki.org



Нарэшце снег! А следам і мароз. У чацвер сіноптыкі абяцаюць да мінус 20—27 градусаў у цэнтры і на поўначы краіны.



Італьянскі прэм’ер Сільвіё Берлусконі, нядаўні госць Аляксандра Лукашэнкі, пацярпеў падчас сустрэчы з народам. 42-гадовы мужчына разбіў яму твар сувенірнай выявай міланскага сабора. Італія скаланаецца ад антыберлусконскіх пратэстаў. Прэм’ера вінавацяць у сувязях з мафіяй і ў карупцыі.



У фінале конкурсу «Міс свету-2009», што адбываўся ў Ёханэсбургу, перамагла прадстаўніца Гібралтара Каен Алдарына. Яна працуе кадравіком. Як адзначае France-Presse, цырымонія прайшла з размахам і афрыканскім каларытам. Тым часам мясцовыя СМІ крытыкавалі ўлады Ёханэсбурга, якія выдаткавалі 12 млн даляраў на конкурс, але не могуць забяспечыць надзённыя патрэбы найбяднейшых слаёў насельніцтва.




**Паважанае спадарства.**

Сардэчна запрашаем вас наведаць Вільню на нашых камфартабельных мікрааўтобусах.
Ад’езды кожны тыдзень у Пт., Сб., Ндз. і Пн.
У 7.30 з Мінска і ў 19.30 з Вільні.
Тэл.(017)284 87 12; (044)736 99 64; (029)15 15 510

## АНЕКДОТЫ

* * *

— Я ў роспачы! Адразу пасля вяселля Мікола перастаў звяртаць на мяне ўвагу!

— Дык развядзіся з ім!

— З кім? Я замужам за Віктарам!

* * *

Ваенком кажа адлічаным студэнтам: «Нічога, хлопцы, цяжка было ў вучэнні — лёгка будзе ў баі!»

* * *

Да чаго дайшоў абсурд. Медыцыну, заснаваную на традыцыях (народную), называюць НЕтрадыцыйнай!

* * *

Аб’ява на дзвярах крамы ў Ізраілі: «Пайшоў на фронт. Буду праз 15 хвілін».

* * *

Худзею адразу па трох дыетах. Па адной не наядаюся.

* * *

Навукоўцы стварылі ўніверсальны суперклей, які клеіць абсалютна ўсё. Цяпер яны занятыя праблемай, як адкруціць цюбік.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

Граф Бабрынскі, калі ў Вільню прыязджаў мірыць тут нацыі і быццам бы бараніць «рускае насяленне» ад палякаў, не адазваўся ні разу аб жывых беларусах, а потым паехаў на вячэру, зробленую яму палякамі, і беларусы былі там толькі… лёкаі, што падавалі стравы і шампанскае.

**«НН». №50. 1909**

Сапраўдны пярэпалах выклікала бяскрыўдная ініцыятыва апазіцыі занесці петыцыі-патрабаванні Лукашэнку. Ужо за пару гадзінаў да меркаванага прыходу людзей рэзідэнцыю ачэплівалі з усіх бакоў шчыльныя ланцугі з соцень «людзей у блакітным». Школьнікам, якія разам з настаўніцамі крочылі на спектакль у Тэатр юнага гледача, таксама прыйшлося ісці ў абход вуліцамі Леніна ды Першамайскай.

**«НН». №34. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6180. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.12.2009.
Замова № 6869.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12